СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАДПІСКА НА 4-ы КВАРТАЛ 2011 ГОДА
Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	квартал
63850 (індывідуальны)	14600	43800
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	13400	40200
63858 (ведамасны)	24800	74400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	22200	66600

Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белпошта»

Індэкс	месяц	квартал
63850 (індывідуальны)	13350	40050
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	12150	36450
63858 (ведамасны)	22511	67533
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	20140	60420

Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»

Індэкс	месяц	квартал
63850 (індывідуальны)	13250	39750
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	12120	36360
63858 (ведамасны)	19591	58773
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18063	54189

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 ВЕРАСНЯ 2011 г.
СУБОТА
№ 183
(27047)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ПРАКАВЕТНАЕ

АБРАКАЛЬНАЯ КРЫНІЦА ДЛЯ ВАЧЭЙ



Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Улясным масіве за вёскай Патаронаўка Клімавіцкага раёна бруіцца невялікая крыніца, вядомая здаўна як чароўная і ратавальніца здароўя. За колер вады яна атрымала назву «Ржавая». Па згадках старажылаў крыніца называлася Іванаўскай за сваё з'яўленне на Івана Купалу. У знак гаючай моцы вады ля крыніцы ўтварылася агромністая «экспазіцыя» абракальных ручнікоў.

— Асаблівa карысная гэтая вадзіца для вачэй, — кажа захавальнік сакральнага месца, жыхар вёскі Судзілы Аляксандр Галкоўскі. Прыходзілі сюды па ваду і шаптухі. Аляксандр Мікалаевіч Галкоўскі (на фотаздымку справа) памятае часы, калі забаранялася наведваць храмы і хадзіць да крыніц. Якраз ад тых падзей і згубілася ў лясных нетрах лекавая крынічка-невялічка. Менавіта яму разам з больш старэйшымі жыхарамі Патаронаўкі давялося блукаць у пошуках згубленага вытоку. Потым, знайшоўшы, ладзіць зруб і ўпарадкаваць тэрыторыю.

Часам «Ржавую» называюць таксама крыніцай Галкоўскага і просяць яго самога паказаць дарогу ў гэты патаемны лясны куток.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў галоўнага рэдактара «Советской Белоруссии» Паўла Якубовіча

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў галоўнага рэдактара ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия» Паўла Якубовіча з 65-годдзем. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НЕСПАКОЙ НА БІРЖАХ

У чацвер сусветныя, у тым ліку і расійскія, біржы абваліліся. Такога значнага абвалу не было з 2008 года. Расія, наша суседка па Мытным саюзе, занепакоілася, бо зрушыўся курс нацыянальнай валюты, саступаючы долару і еўру.

Але непакоіцца і ўвесь свет. Падзенне фондавых рынкаў два дні таму зацямніла нават амаль двухмесячнай даўнасці паніжэнне пасля змяншэння рэйтынгавым агенцтвам Standart & Poor's крэдытнага рэйтынгу ЗША.

Лічыцца, што інвестары сталі пазбаўляцца «рызыкоўных» актываў пасля пасяджэння Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША (выконвае ролю цэнтральнага банка), якое адбылося ў сераду. Аднак захадам, якія прымае Бен Бернанке, кіраўнік ФРС, ніхто не давярае. Ды і сама рэзервовая сістэма прызнае, што «слабасць агульных умоў на рынку працы, узровень беспрацоўя застаюцца павышанымі». Гэта значыць, аптымізму наконт аднаўлення амерыканскай эканомікі не засталося. А эксперты ўвогуле разважаюць толькі ў рэчышчы скепсісу. І інвестары прытрымліваюцца той жа думкі: амерыканскія і еўрапейскія ўлады не здольныя прапанаваць рынкам выразныя планы па прадухіленні рэцэсій ЗША і еўразоны, а таксама банкруцтва Грэцыі. Усё гэта добра ілюструюць факты: 18 асноўных фондавых індэксаў краін Заходняй Еўропы ўпалі, знізіўся рынкавы кошт найбуйнейшай горназдабываючай кампаніі свету BHP Billiton Ltd., патаннелі акцыі еўрапейскіх банкаў.

Што тычыцца Расіі, то ёй трэба асцерагацца зніжэння каціровак акцый і нафты, бо гэта можа аказваць ціск на рубель. Ужо нават пачалі з'яўляцца плёткі аб тым, што Цэнтрабанк рыхтуе дэвальвацыю расійскага рубля.

Эксперты лічаць, што для таго, каб праблемы закончыліся, неабходны ўпэўнены рост сусветнай эканомікі, бо любыя прыкметы паслаблення росту прыводзяць да панікі на рынках.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ДОЛАР І РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ ІДУЦЬ УНІЗ, ЕЎРА СТАІЦЬ

Пасля чарговай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы нейкіх значных зрухаў не адбылося. Долар ізноў патаннеў на 60 рублёў, расійскі рубель — на 3, курс жа еўра застаўся на старым узроўні.

Нагадаем, што намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Румас 21 верасня сказаў, што выхад на раўнаважны курс можа адбыцца ў кастрычніку.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

РЫНКАВЫЯ КУРСЫ НА 23 ВЕРАСНЯ:

Долар ЗША — 7890 беларускіх рублёў;

Еўра — 10660 беларускіх рублёў;

Расійскі рубель — 246 беларускіх рублёў.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 23 ВЕРАСНЯ:

«Беларусбанк»: долар ЗША — 7450 і 7900; еўра — 10000 і 10600; расійскі рубель — 230 і 245.

«Трастбанк»: долар ЗША — 7570 і 7950; еўра — 9600 і 10900; расійскі рубель — 160 і 260.

«Мінскі транзітны банк»: долар ЗША — 7400 і 7900; еўра — 9850 і 10700; расійскі рубель — 225 і 248.

У МІНСКУ АЎТАМАБІЛЬ ВЫЕХАЎ НА ТРАТУАР І ЗБІЎ ТАМ ПЕШАХОДА

23 верасня ў гадзіну пік непадалёк ад гіпермаркета «Мацярык» зноў адбылося сур'ёзнае ДТЗ (нагадаем, што некалькі тыдняў таму каля гэтага будаўнічага цэнтра джып з п'янай моладдзю пратараніў некалькі прыпаркаваных машын). Учора раніцай аўтамабіль «Chevrolet Lacetti» (хуткасць была каля 100 км/г) вылецеў на тратуар і збіў мужчыну.

Вось што паведамляе ДАІ Фрунзенскага раёна: «Кіроўца ехаў па вуліцы Лабанка з боку вуліцы Адзінцова ў кірунку вуліцы Прытыцкага і на скрыжаванні з вуліцай Бурдзейнага страціў кантроль над аўтамабілем. Машына ўрэзалася ў бардзюр, затым апынулася на пешаходнай дарожцы, дзе збіла мужчыну гадоў 50-60. Першымі на месца здарэння прыбылі супрацоўнікі дэпартамента «Ахова», якія дзяжурылі ў гіпермаркеце. Алкатэстар паказаў, што кіроўца цвярозы. Будзе праводзіцца праверка і, магчыма, аўтатэхнічная экспертыза, якая высветліць, што здарылася з аўтамабілем».

Пацярпелы ў надзвычай цяжкім стане быў дастаўлены ў бальніцу. Побач з месцам аварыі знаходзіцца выхад з метро «Каменная горка» і прыпынак грамадскага транспарту. Там заўсёды шматлюдна, а ў раніцні час — надзвычай. На шчасце, больш ніхто не пацярпеў: некаторыя людзі проста паспелі ўхіліцца. Машына пасля таго, як збіла пешахода, змяніла напрамак руху і, выехаўшы на зялёную зону, спынілася. Аўтамабіль таксама моцна пашкоджаны: ёсць увагнутасці, разбіта лабавое шкло, ад удару аб бардзюрны камень лопнула пакрышка.

Алена КРАВЕЦ.

АРЫШТАВАЛІ МАШЫНЫ «ЛЕВЫХ» ПЕРАВОЗЧЫКАЎ

Сёлета супрацоўнікі падатковых інспекцый Віцебскай вобласці выявілі каля ста фактаў таго, калі грамадзяне, не з'яўляючыся прадпрымальнікамі, перавозілі пасажыраў. У адносінах да «левых» перавозчыкаў, якія «папаліся» паўторна, складзены адміністрацыйныя пратаколы. Толькі сёлета за першыя восем месяцаў за ажыццяўленне незаконнага перавозу пасажыраў накладзены арышт на аўтамабілі агульным коштам звыш 320 мільёнаў рублёў. Вінаватыя заплацілі штраф на агульную суму больш як 9 мільёнаў рублёў.

Таксама падчас аператыўных кантрольных мерапрыемстваў супрацоўнікі падатковых органаў устанавілі каля трыццаці парушэнняў у рабоце легальных перавозчыкаў, якія маюць адпаведную дзяржаўную ліцэнзію. Дадаткова яны выплацілі падаткі на суму 3,1 мільёна рублёў. Па выніках разгляду адміністрацыйных матэрыялаў да адказнасці прыцягнулі 23 парушальнікаў. Яны заплацілі штрафы на агульную суму звыш 17 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ГАТОВА НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ ВЫБРАЦЬ ІНВЕСТАРА ДЛЯ АСВАЕННЯ НОВЫХ РАДОВІШЧАЎ КАЛІЮ»

Беларусь гатова, не зацягваючы тэрміны, на конкурснай аснове выбраць інвестара для асваення новых перспектыўных радовішчаў калійных салей. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 23 верасня на сустрэчы з кіраўніком групы кампаній Boulle Mining Group Жанам-Раймонам Булем, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Мы ніколі не скрывалі той факт, што вядзём сур'ёзную прапрацоўку па адным з асноўных інвестыцыйных праектаў у нашай краіне. Я маю на ўвазе пытанні распрацоўкі новых радовішчаў калійных салей у Беларусі і ацэнкі кошту нашага асноўнага здабыўнога прадпрыемства «Беларуськалія». Ацэнка завершана, і Ашчадны банк пацвердзіў нашу цану $30 млрд», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца распрацоўкі новых радовішчаў калійных салей, то, паводле слоў Прэзідэнта, ёсць шэраг прапаноў інвестараў, у тым ліку ад групы кампаній Boulle Mining Group.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што прасіў ва ўрадзе прапрацаваць усе прапановы, якія паступілі.

«Мы сёння павінны дакладна і пэўна сказаць, у якім напрамку будзем рухацца, у тым ліку па распрацоўцы новых радовішчаў калійных салей, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Рынак калійных угнаенняў на ўздыме. Усе буйныя ўдзельнікі канстатуюць гэты факт. Рост спажывання і попыту на прадукты харчавання садзейнічае росту цэн на ўгнаенні. Гэта вельмі выгадны бізнэс і для нашай дзяржавы. Таму трэба ўдзяліць гэтаму асаблівую ўвагу».

У той жа час Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Галоўная ўмова адна — ні ў якім выпадку не тармазіць гэтыя працэсы. Ёсць інвестары, хто прапануе лепшыя ўмовы, той і будзе распрацоўваць новыя радовішчы. Хто прапануе большую цану, калі нам трэба будзе прадаць нейкія акцыі нашага асноўнага прадпрыемства, тады мы будзем вырашаць пытанне».

«Але ўсё павінна быць сумленна, адкрыта, на конкурснай аснове: лепшыя ўмовы, лепшыя прапановы будуць адразу прыняты», — дадаў Прэзідэнт.

Пасля заканчэння сустрэчы Жан-Раймон Буль адзначыў, што адбылася канструктыўная размова. «Мы лічым, што існуе спрыяльны клімат для інвеставання ў Беларусь. Група кампаній Boulle Mining Group правядзіць перагаворы з урадам па праекце інвеставання ў горназдабыўную прамысловасць на мільярды долараў у сферы вытворчасці калійных угнаенняў», — сказаў ён.

Boulle Mining Group з'яўляецца групай прыватных кампаній, галаўны офіс знаходзіцца ў Люксембургу. Асноўны напрамак дзейнасці — стратэгічнае інвеставанне ў прыватныя і дзяржаўныя кампаніі, занятыя ў сферы маркетынгу, будаўніцтва, геалагічнай разведкі і здабыўной прамысловасці па ўсім свеце.

«ГАЗПРАМ» МОЖА ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У КУПЛІ АКЦЫЙ БЕЛАРУСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ АПРОЧ «БЕЛТРАНСГАЗА»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы са старшынёй праўлення ААТ «Газпрам» Аляксеем Мілерам, перадае БЕЛТА.

«Не выключаю, гэта адно з пытанняў — акцыянаванне і купля акцый «Белтрансгаза», магчыма, і іншых прадпрыемстваў, якія будуць цікавіць «Газпрам», і калі «Газпрам» пагодзіцца на тыя ўмовы, якія сёння прапануюцца ў Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Працэнтныя стаўкі па заключаных крэдытных дагаворах у Беларусбанку застануцца нязменнымі

Памер працэнтных ставак па ўжо заключаных крэдытных дагаворах у Беларусбанку застанецца нязменным, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе банка.

У сувязі з ростам стаўкі рэфінансавання Беларусбанк павысіў стаўкі па крэдытах для насельніцтва. Аднак гэта закране толькі нядаўна заключаныя дагаворы. «Змены не закрануць тых, хто ўжо карыстаецца гэтымі крэдытамі, і шматдзетныя сем'і. Памер новай працэнтнай стаўкі па-ранейшаму залежыць ад месца пражывання крэдытаатрымальніка», — запэўнілі ў банку, падкрэсліўшы, што Беларусбанк — адзіны банк, які ўлічвае месца пражывання грамадзян, а таксама іх сярэднюю заработную плату і ў залежнасці ад названых фактараў устанаўлівае працэнтную стаўку па крэдытах як на спажывецкія патрэбы, так і на фінансаванне нерухомай маёмасці.

Так, крэдыты на спажывецкія патрэбы на тэрмін да 1 года прадастаўляюцца пад 35 працэнтаў гадавых, а грамадзянам, якія пражываюць і працуюць у сельскіх населеных пунктах, — 34 працэнты гадавых. Крэдыты на спажывецкія патрэбы на тэрмін да 5 гадоў — на агульных падставах 40 працэнтаў гадавых, сельскім жыхарам — 38 працэнтаў гадавых.

Што датычыцца крэдытаў на будаўніцтва жылля, то пры стаўцы рэфінансавання ў памеры 30 працэнтаў гадавых, стаўка для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — 31 працэнт гадавых, а для грамадзян, якія пражываюць у вёсцы, — 30 працэнтаў, гэта значыць у памеры стаўкі рэфінансавання. Працэнтная стаўка па крэдытах для кліентаў, не маючых ільгот, адзіная — 38 працэнтаў гадавых.

Беларусбанк, улічваючы рэкамендацыі Нацбанка, застаецца на баку пазычальнікаў і фарміруе стаўку па крэдыце недзе на ўзроўні сярэдняй паміж той, што ёсць на бягучы момант, і той, якая была на дату заключэння крэдытнага дагавора. Таксама Беларусбанк прыняў рашэнне аб правядзенні работы па зніжэнні фінансавай нагрузкі на бюджэт крэдытаатрымальнікаў, якія ажыццяўляюць пагашэнне крэдытаў у замежнай валюце. Напрыклад, ім прадастаўляюць адтэрміноўку на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдытах на тэрмін да 6 месяцаў, прадаўжаюць тэрмін карыстання такімі крэдытамі. У выпадку калі ў крэдытаатрымальніка штомесячны плацеж у замежнай валюце павялічыўся ў сувязі з павелічэннем рублёвага эквіваленту, кліент мае права звярнуцца ў банк для разгляду пытання ў індывідуальным парадку.

«Крэдытаатрымальнік павінен прадаставіць даведку аб даходах па месцы атрымання заработнай платы. Напрыклад, даход у яго год таму складаў паўтара мільёна рублёў у месяц і на сённяшні дзень не змяніўся. Пры курсе Br3 тыс. за $1 плацеж па крэдыту ў яго быў пад'ёмны, крэдытаатрымальніка задавольвала, што плацеж па крэдыту не перасягаў 50 працэнтаў яго даходу», — адзначылі ў банку. Тут гатовы ісці на ўступкі, каб плацяжы па крэдытах для фізічных асоб былі такімі ж, як у мінулым годзе ў долараным эквіваленце.

ПАТЭНЦЫЯЛ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА Ў ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОЦЕ НЕ Ў ПОЎНАЙ МЕРЫ

Такое меркаванне выказаў журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў. Ён прымае ўдзел у семінары ідэалагічных работнікаў Магілёўшчыны «Асаблівасці ідэалагічнай работы ў сучасных умовах», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

На думку Аляксандра Радзькова, Беларуская федэрацыя прафсаюзаў — гэта вельмі магутная арганізацыя, але яна захапілася грамадскай работай: правядзеннем культурна-масавых, спартыўных мерапрыемстваў, аздараўленнем і неяк адасобілася ад палітычнага жыцця дзяржавы, заняла крыху пабочную назіральную пазіцыю. «А гэты ж патэнцыял можна больш актыўна выкарыстоўваць на карысць дзяржавы», — лічыць Аляксандр Радзькоў.

Паводле яго слоў, асноўным звяном у ідэалагічнай рабоце з'яўляецца, вядома, ідэалагічная вертыкаль, якая павінна працаваць мэтанакіравана і сістэмна. А сістэма выбудоўваецца толькі тады, калі бачыш базісную структуру, важным элементам якой з'яўляецца правядзенне семінараў з удзелам ідэалагічнага актыву. Важна, каб людзі бачылі і размаўлялі адзін з адным, абменьваліся перадавымі метадамі і вопытам работы. Яскравы прыклад таго на Магілёўшчыне — работа ААТ «Магілёўхімвалакно». Прадпрыемства працуе стабільна і эфектыўна, яго прадукцыя карыстаецца павышаным попытам. Таму лёгка развіваць эканоміку, калі ёсць дзе, ёсць сучасныя тэхналогіі, кваліфікаваныя кадры і высокі патэнцыял. Тут людзі даражаць сваім рабочым месцам і працуюць з задавальненнем. Гэта відаць па іх настроі, па сацыяльнай інфраструктуры, якая развіваецца. Гэта таксама адна з форм ідэалагічнай работы.

Аляксандр Радзькоў лічыць, што дзякуючы такім семінарам, сустрэчам радавых выканаўцаў, кіраўнікоў буйных прамысловых прадпрыемстваў, грамадскіх структур, мясцовых улад з'яўляецца дакладнае разуменне, што ў ідэалагічнай рабоце «мы не адны». Разам можна лягчэй перанесці любыя нягоды, пераадолець крызісы. «Наша зямля, наш народ, наша краіна — гэта аснова нашай ідэалогіі: прыгожыя, разумныя людзі, паспяховая вытворчасць, эфектыўная эканоміка — гэта трэба развіваць, і ў гэтым сутнасць ідэалагічнай работы», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў.

Сярэдняя зарплата ў Беларусі за жнівень узрасла на 7,4 працэнта, або на Br137,8 тыс.

У Беларусі намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў у студзені—жніўні гэтага года склала Br1654,4 тыс., паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Сярэдняя зарплата ў жніўні гэтага года дасягнула Br1992,3 тыс. і павялічылася ў параўнанні з ліпенем на 7,4 працэнта, або на Br137,8 тыс.

Паводле звестак Белстата, у прамысловасці сярэдняя заработная плата ў жніўні склала Br2303,2 тыс., у будаўніцтве — Br2316,3 тыс., на транспарце і ў сувязі — Br2181 тыс., у сельскай гаспадарцы, лясной гаспадарцы — Br1485,4 тыс.

Сярэдні жнівеньскі заробак у адукацыі быў роўны Br1328,4 тыс., у тым ліку настаўнікаў — Br1530,8 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br2158,3 тыс. Заработная плата работнікаў аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг у жніўні склалася ў памеры Br1501,8 тыс., у тым ліку ў галіне аховы здароўя — Br1536,8 тыс. Сярэдняя заработная плата ўрачоў была Br2453,8 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — Br1458,9 тыс.

Самая высокая сярэдняя заработная плата ў жніўні зафіксавана па такіх відах эканамічнай дзейнасці, як дзейнасць, звязаная з вылічальнай тэхнікай, — Br5158 тыс., вытворчасць коксу, нафтапрадуктаў і ядзерных матэрыялаў — Br4621,8 тыс., здабыча паліўна-энергетычных карысных выкапняў — Br4084 тыс., паветраны транспарт — Br3645 тыс., фінансавае пасрэдніцтва — Br3632,8 тыс., дзейнасць у галіне архітэктуры, аказанні інжынерных паслуг — Br3568,1 тыс. Самы нізкі гэты паказчык — у прадастаўленні сацыяльных паслуг (Br1268,9 тыс.), рамонце бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (Br1264,4 тыс.).

Паводле статыстычных даных, рэальная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені—жніўні гэтага года ў параўнанні са студзенем—жніўнем 2010-га павялічылася на 10,1 працэнта. У жніўні ў параўнанні з ліпенем гэтага года гэты паказчык зменшыўся на 1,4 працэнта.

Максімальны тэмп росту рэальнай заработнай платы ў студзені—жніўні гэтага года да ўзроўню студзеня—жніўня 2010-га забяспечаны ў адукацыі (125,1 працэнта), дзейнасці, звязанай з вылічальнай тэхнікай (124,2 працэнта), арэндзе машын і абсталявання і пракаце бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (122,7 працэнта), вытворчасці транспартных сродкаў і абсталявання (121,9 працэнта), ахове здароўя і прадастаўленні сацыяльных паслуг (120,6 працэнта). Найменшы гэты паказчык — у дзейнасці ў галіне радыёвяшчання і тэлебачання (95,2 працэнта), у галіне архітэктуры, аказанні інжынерных паслуг (97,4 працэнта), на паветраным транспарце (99,5 працэнта).

У цэлым па прамысловасці рэальная заработная плата ў студзені—жніўні 2011 года ўзрасла да ўзроўню студзеня—жніўня 2010-га на 9,7 працэнта, у рабочых і служачых — на 10 працэнтаў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СОРАС ЛІЧЫЦЬ, ШТО Ў ЗША ЎЖО ПАЧАЛАСЯ РЭЦЭСІЯ Ў ЭКАНОМІЦЫ

Вядомы амерыканскі мільярдэр і фундатар Джордж Сорас лічыць, што эканоміка ЗША ўжо зараз перажывае другую хвалю рэцэсіі і вінаватыя ў гэтым рэспубліканцы, якія выступілі супраць плана Барака Абамы адносна падаткова-бюджэтнага стымулявання.

Адказваючы на пытанне вядучага амерыканскага тэлеканала CNBC пра магчымую пагрозу новай рэцэсіі ў эканоміцы ЗША, 81-гадовы фінансіст адказаў: «Я думаю, што яна ўжо наступіла».

Адзначым, што афіцыйнага пацвярджэння заявы Сораса пакуль яшчэ няма, бо рэцэсія характарызуецца спадам у эканоміцы па выніках двух кварталаў запар.

Амерыканскі фінансіст, багацце якога часопіс Forbes ацэньвае ў 22 млрд долараў, таксама параўнаў цяперашні пазыковы крызіс у Еўропе з крахам банка Lehman Brothers у 2008 годзе. «Гэта нават больш небяспечная сітуацыя, чым з Lehman Brothers, і я думаю, што ўлады для ўрэгулявання крызісу будуць рабіць усё магчымае, каб захаваць фінансавую сістэму. Альтэрнатыву гэтаму цяжка нават уявіць», — адзначыў Сорас. Ён мяркуе, што невялікія краіны еўразоны, хутчэй за ўсё, абвесцяць дэфолт і пакінуць зону адзінай еўрапейскай валюты. Але калі гэта адбудзецца, сусветную эканоміку чакаюць узрушэнні.

РАСІІ ПРЫЙШЛОСЯ ВЯРНУЦЬ ІРАНУ 167 МЛН ДОЛАРАЎ ЗА НЕПАСТАЎЛЕНЫЯ КОМПЛЕКСЫ С-300

Кіраўнік «Расабаронэксперта» Анатоль Ісайкін распавёў, якія страты панесла расійская «абаронка» ў плане паставак зброі за мяжу. Ён прызнаў, што дзяржкарпарацыі прыйшлося вярнуць Ірану аванс за пастаўку зенітна-ракетных комплексаў С-300. Пры гэтым ён назваў дакладную суму авансу — 167 млн долараўў, адзначыўшы, што гэта «не такая вялікая сума», але ўсё ж страта.

У ФРАНЦЫІ МОЖА З'ЯВІЦЦА ПРЭЗІДЭНТ У ПАРАНДЖЫ

У Францыі напярэдадні за нашэнне паранджы былі аштрафаваны першыя дзве мусульманкі, 32-гадовая Хінд Ахмас і 36-гадовая Нажат Найт Алі, аднак на судзе яны не прысутнічалі, бо адмовіліся здымаць паранджу ў будынку суда. У той жа час суддзя парыжскага прыгарада Мо адхіліў просьбу абвінавачвання адправіць іх на курс грамадзянскага выхавання.

Тым часам, як паведамляе брытанская The Daily Mail, каля будынка суда ісламская актывістка і маці-адзіночка, 32-гадовая Кенза Дрыдэр заявіла пра свой намер балатавацца ў прэзідэнты Францыі на выбарах будучага года, каб абараніць права французскіх жанчын апранацца так, як ім падабаецца. Выданне нагадвае, што паводле новага закона нашэнне паранджы ў грамадскіх месцах з'яўляецца крымінальным злачынствам, якое караецца штрафам у памеры 150 еўра, а ў некаторых выпадках — праходжаннем курсу грамадзянскага выхавання.

НА «АКТОБЭРФЭСЦЕ» ВЫЯВІЛІ НЕДАЛІЎ ПІВА

Нямецкая арганізацыя Verein gegen betrugerisches Einschenken (VGBE), якая змагаецца з недалівам піва, выявіла масавыя парушэнні на штогадовым свяце піва «Актоберфэст» у Мюнхене.

Прадстаўнікі арганізацыі купілі каля 100 літровых кружак піва ў 12 намётах на тэрыторыі, дзе праводзіцца фэст. У большасці выпадкаў замест абяцанага літра ў кружку налівалі каля 900 мілілітраў. У адным намёце барацьбітам з недалівам прадалі ўсяго 730 мілілітраў напою. Варта адзначыць, што кошт літра піва на фэсце ў сярэднім складае каля дзевяці еўра. Такім чынам, на разліках барацьбітоў з недалівам, кожнага наведвальніка мерапрыемства ашуквaюць амаль на еўра за кружку.

У ШВЕЦЫІ ВЫСЯЛЯЮЦЬ З КВАТЭР КІНАМАНА І ДЗІЦЯ

Мужчына сярэдніх гадоў з'яўляецца гарачым прыхільнікам камедый, знятых у 1930—1940-я гады, і кожны раз пры іх праглядзе смяецца.

Чалавек гэты жыве ў здымнай кватэры ў Гётэборгу. Суседзі неаднаразова рабілі яму заўвагі і скардзіліся. Можа, усё і абышлося б, бы толькі кінаман прызвычаіўся глядзець свае фільмы па начах. Пасля чаго суседзі паскардзіліся ў муніцыпалітэт. Мясцовы трыбунал па разборы спраў, звязаных з арэндай жылля, пастанавіў, што мужчына мае права паводзіць сябе так, як яму хочацца. Аднак апеляцыйны суд заходняй Швецыі даў добро на высяленне вясёлага жыхара. Падобная сітуацыя, якую можна нават назваць і шакіруючай, склалася ў канцы жніўня ў шведскім жа горадзе Хофарс. Там сям'я пачала вызваляць кватэру, якую яна арандавала, з-за плача 9-месячнага дзіцяці, на якога паскардзіліся суседзі. Маўляў, дзіця ўжо не немаўля і павінна маўчаць.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 30 СЕНТЯБРЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О внесении изменения в решение Общего собрания акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк» по вопросу об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

3. Об утверждении локальных нормативных и правовых актов ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 27 сентября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 30 сентября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 27 сентября 2011 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 73, 218 84 12.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	5 541,00	1 чэшская крона	302,09
▲ 1 еўра	7 491,43	1 польскі злоты	1 673,66
1 латвійскі лат	10 589,58	▼ 1 расійскі рубель	172,57
1 літоўскі літ	2 175,33	1 украінская грыўня	692,24

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	32,1083
10 UAH	40,1354
10000 BYR	58,2094
EUR	43,3655

Агентства ўрадавага грамадзянства

З КУКУРУЗАЙ МІЛЬЁН БУДЗЕ І Ў ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Што расце на пясчанай глебе? Ці будзе дзе захоўваць вырашчаны ўраджай? Што раскажам на «Дажынках»? Як зарабляць аграturызмам? Як зменшыць імпартны складнік у прадукцыі, прызначанай на экспарт? Адказ на гэтыя і многія іншыя актуальныя пытанні шукалі журналісты Гомельскай вобласці на прэс-канферэнцыі старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра ДВОРНІКА.

— Мы станоўча ацэньваем сітуацыю на Гомельшчыне. Рэнтабельнасць вытворчасцяў павялічылася на 2,5 %. Сума прыбытку выраслa ўдвая. Тым не менш, пры агульным узроўні росту вытворчасці ў 112 %, ёсць і стратныя прадпрыемствы — у нас іх каля 75.

— Што робіцца для павелічэння сальда знешняй гандлёва-эканамічнай дзейнасці?

— За сем месяцаў аб'ём экспарту тавараў вобласці склаў $2,8 млрд, тэмп росту — 184 % да адпаведнага перыяду 2010 года, што дазволіла забяспечыць прырост сальда на $298,8 млн у параўнанні са студзенем—ліпенем 2010 г. Гэта высокія паказчыкі, але добра было б, каб гэтыя працэнты не мелі імпартнага складніка ў вытворчасці прадукцыі. Таму наша задача — не толькі экспарт павялічыць, але і знізіць імпартны складнік у прадукце. З пачатку года мы знізілі імпартны складнік на $100 млн у параўнанні з мінулым годам. Аднак у Гомелі ёсць прадпрыемствы, якія загружаны толькі на 30-45 %. Мы шукаем магчымасць загрузіць іх — менавіта шляхам зніжэння кошту імпартных складнікаў. Гэта дасць не толькі дабаўленую вартасць, але і валюту не трэба будзе расходаваць. Мы загрузім свае прадпрыемствы і дадзім жыццё нашым вытворчасцям, нашым людзям. Першыя крокі ўжо зроблены, але гэта толькі пачатак.

— Сёлетнія перспектывы экспарту сельгаспрадукцыі?

— Па экспарце прадуктаў харчавання ў Расію і іншыя краіны СНД з пачатку года мы маем 140 % да леташняга ўзроўню. У гэтай прадукцыі невысокі імпартны складнік: выкарыстоўваюцца наша зямля, нашы людскія затраты. Таму сельгаспрадукцыю нам вельмі выгадна прадаваць на экспарт. Калі мы прадаём яе ў Расію, у параўнанні з нашым унутраным рынкам маем дзве цаны — і гэта выгадна. Чым больш мы будзем прадаваць за межы краіны, тым лепш будзе ўсёй сельскай гаспадарцы.

Валавы збор бульбы ў Гомельскай вобласці сёлета ўдвая перавысіць леташні аб'ём. Сярэдняя ўраджайнасць — 210 цэнтнераў з га, летась было 141. Значна больш сабрана і іншай агародніны.

— Ці змянілася ў вобласці сітуацыя са сховішчамі для гародніны?

— Дарэчы, добры ўраджай сёлета сабраны і ў Расіі. Але ж нашы ўсходнія суседзі не маюць вялікіх сховішчаў, а мы за год імі прыраслі. У сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці дзейнічаюць сховішчы для агародніны аб'ёмам 33 тысяч тон. Яны сучасныя, абсталяваныя мікракліматам. Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю яшчэ 2 новыя сучасныя сховішчы (Камбінат «Усход» Гомельскага раёна — 20 тысяч тон і сялянская гаспадарка Міхаіла Шруба ў Жыткавіцкім раёне — 6 тысяч тон).

— Чаму хлебаробы Гомельшчыны — адзіныя ў краіне, хто не змог вырасціць мільён тон збожжа?

— Сёлетні год быў анамальна сухім і гарачым у маі-чэрвені. Надвор'е не дазволіла вырасціць запланаваны ўраджай. Па ацэнках спецыялістаў, агульны недабор зерня з-за пашкоджання значнай часткі пасеваў склаў больш за 10 %. У выніку засуха стала прычынай таго, што рэгіён стаў адзіным сярод абласцей рэспублікі, дзе не атрымалася намалаціць 1 млн тон збожжа. Асабліва для мяне былі важныя прапановы мясцовых спецыялістаў, якія многія гады працуюць на гэтых бедных пясчаных землях. Задача — атрымаць рэальную выгаду, як ад павышэння сярэднямесячных тэмператур, так і ад павялічэння працягласці вегетацыйнага перыяду.

— Якім культурам будзе аддавацца перавага?

— Сёння кліматычныя ўмовы на Гомельшчыне падобныя на тыя, што адпавядаюць шыраце Кіева. Гэта азначае, што неабходна аддаваць прыярытэт паўднёвым культурам, у першую чаргу тым, якія шырока распаўсюджаны ва Украіне. Асноўнае патрабаванне — засухаўстойлівасць. Акрамя таго, яны павінны мець стрыжневы корань, які дазваляе знаходзіць вільгаць у глыбейшых пластах глебы: падчас засухі на глыбіні 20-30 см вільгаці практычна няма. З-за гэтага гіне частка ўраджаю. Таму ў першую чаргу будзем аддаваць перавагу кукурузе. Між іншым, летась дзякуючы ёй мы літаральна выратавалі грамадскую жывёлагадоўлю. Ва ўсходніх раёнах вобласці тады павыгарала ўсё — шматгадовыя травы, пашы, збожжавыя. Засуху вытрымала толькі кукуруза, і ўжо з канца ліпеня рацыён жывёл амаль на 100% складала яе зялёная маса. Вядома, гэта стварыла пэўныя праблемы з нарыхтоўкай кармоў на зімовы перыяд.

Сёлета мы прынялі рашэнне пашырыць пасевы кукурузы амаль на 40 % — да 250 тысяч га. На пачатку верасня мы пачалі яе масавую ўборку на сілас. Закончым уборку кукурузы прыкладна 15 кастрычніка. Дадатковыя пасевы плюс прырост ураджайнасці зялёнай масы амаль на 70 ц з гектара дазволяць нарыхтаваць больш чым 4,4 млн тон сіласу, што ўдвая перавышае леташнія паказчыкі. На ўмоўную галаву жывёлы гэта складзе 42 цэнтнеры кармавых адзінак травяністых кармоў супраць 22 цэнтнераў летась. Гэта дазволіць павялічыць аб'ёмы сельскагаспадарчай прадукцыі, яе экспарт, палепшыць эканамічныя паказчыкі. Бо, хочам ці не, мы павінны выраўноўваць цэны з нашымі суседнімі дзяржавамі. А калі мы атрымаем двухгадовы запас кармоў, сабекошт прадукцыі застанецца першапачатковым. Сельгасвытворцы ў выніку атрымаюць вялікую эканомію, рэнтабельнасць.

— Кукуруза — адзіная перспектыўная для Гомельшчыны культура?

— Ёсць яшчэ адзін перспектыўны праект. Дзякуючы кукурузе выйсце кармавых адзінак з гектара стала значна вышэй. У выніку вызваляецца частка пасяўных плошчаў, на якіх раней нарыхтоўваліся травяністыя кармы. І таму хутка на нашы палі прыйдзе яшчэ адзін паўднёвы госць — сланечнік. Пад гэтую культуру плануецца адразу адвесці 70 тысяч гектараў. Такі выбар прадыктаваны тым, што асноўны рацыён кармлення буйнарагатай жывёлы павінен складацца з травяністых кармоў, збожжа і кармавога бялку. У наш час прыкладна 95% гэтага бялку вобласць закупляе за межамі рэспублікі за валюту. У многіх краінах свету гэтую праблему вырашаюць менавіта за кошт сланечніку. Прычым кармавы бялок атрымліваецца з пабочных прадуктаў перапрацоўкі насення сланечніку, з макухі. З іншага боку, насенне сланечніку — гэта алей, які сёння з'яўляецца для Беларусі стратэгічным прадуктам, і ён таксама на ўсе 100% імпартны. Цёплы клімат дазволіць нам вырошчваць тое, што 15-20 гадоў таму назад было нерэальна.

— З чым дзелегацыя Гомельскай вобласці накіруецца ў Маладзечна на сёлетнія «Дажынкі»?

— Нам не сорамна будзе ехаць на «Дажынкі». Валавы збор збожжа на Гомельшчыне дасягнуў 925 тысяч тон — з улікам ураджаю прысядзібных участкаў насельніцтва і фермерскіх гаспадарак. Вобласць у поўным аб'ёме выканала дзяржзаказ па харчовым збожжы, забяспечыла запатрабаванні жывёлагадоўчай галіны ў фуражы. Ураджайнасць збожжавых культур у параўнанні з мінулым годам выраслa на 4 цэнтнеры і склала 28,8 ц/га.

Акрамя таго, мы чакаем атрымаць мінімум 250 тысяч тон зерня кукурузы. І калі скласці ўсё разам, мы атрымаем зерня не менш, чым любая іншая вобласць краіны. Зараз чакаем, пакуль кукуруза дойдзе да васковай спеласці. Да «Дажынак» у Маладзечне, думаю, мы будзем мець каля 30 кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы. Мяркую, што вышэй паказчыка ў рэспубліцы не будзе.

— Ці задаволены вы ўзроўнем развіцця агратурызму ў вобласці?

— У развітых краінах турыстычныя паслугі займаюць да 70 % ВВП. Сёння ў вобласці створана каля 400 аграсядзіб. Але ж толькі палова з іх працуе рэальна. Другая палова знаходзіцца ў стадыі падрыхтоўкі, рамонту, рэканструкцыі і гэтак далей. Да канца года ў вобласці плануецца стварыць яшчэ 171 аб'ект аграэкатурызму. Па колькасці турыстаў, якія наведалі сядзібы на базе сялянскіх і фермерскіх гаспадарак і аб'ёме грашовых сродкаў, атрыманых ад рэалізацыі гэтых паслуг, наша вобласць займае адну з лідзіруючых пазіцый у краіне. Лепшыя аграсядзібы распісаны на 3 месяцы наперад. Будучыня ў гэтага напрамку ёсць.

— Як ацэньваеце ход рэалізацыі дзяржаўнай Праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся?

— Агульны аб'ём бюджэтных сродкаў, якія накіроўваюцца сёлета на рэалізацыю праграмы, складае каля 112 млрд рублёў. Рэсурсы сканцэнтраваны на ўводных аб'ектах і на аб'ектах з высокай ступенню гатоўнасці. Зараз у поўным аб'ёме прафінансаваны 44 з 133 мерапрыемстваў. Тэрміны выканання іншых мерапрыемстваў праграмы будуць перанесены з 2011 года на наступныя.

Спадзяюся, што крызісны перыяд будзе нядоўгім. Вы бачыце: эканоміка развіваецца, жаданне працаваць у людзей ёсць. Гэты крызіс адкрыў вочы на многія рэчы кіраўнікам прамысловых прадпрыемстваў. У сацыяльнай сферы таксама больш эфектыўна сталі адносіцца да кожнага бюджэтнага рубля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Антикризисный управляющий ОАО «Гомельчанка»
ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий и состоятся 12 октября 2011 года в 11 часов 00 минут по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 286.

На торги выставляется:

№ п/п	Наименование имущества	Рыночная стоимость без учета НДС, долларов США
1	Здание швейного цеха — двухэтажное здание, площадью 1.021,5 м² (Гомельская область, Буда-Кошелевский район, г.п. Уваровичи, ул. Советская, 20)	61.706,4
2	Часть здания АБК с встроенным оборудованием, транспортной проходной, благоустройством, площадью 5.706,3 м² (г. Гомель, ул. Ильича, 286)	1.288.000

Шаг аукциона 5% от начальной цены лота.

Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет ОАО «Гомельчанка» — 3012201010012 в ГФ по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 151501768, г. Гомель, ул. Советская, 7, УНН 400021644.

Заключение договора купли-продажи в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, срок и условия оплаты определяются по согласованию Победителя с Продавцом при заключении договора купли-продажи.

Для участия в аукционе необходимо предоставить: заявление на участие, копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; для резидентов Республики Беларусь: юридическим лицам — доверенность представителя юридического лица (в случае необходимости таковой), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; представителям физических лиц — копию свидетельства о государственной регистрации (без нотариального засвидетельствования); для нерезидентов Республики Беларусь: юридическим и физическим лицам — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (без нотариального засвидетельствования); представителям юридических и физических лиц — легализованную в установленном порядке доверенность.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Задаток, внесенный Победителем будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Продавцом.

Оплата стоимости приобретенного предмета торгов осуществляется в установленном законодательством порядке:

- победителем торгов, являющимся резидентом Республики Беларусь, — в рублях;

- победителем торгов. являющимся нерезидентом Республики Беларусь, — в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.

Заявки на участие в аукционе принимаются **до 15.00 11 октября 2011 г.**

Дополнительную информацию можно получить по тел. 39 06 24 (ф).

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от 15.11.2010 г.

Сведения о застройщике:
Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

Режим работы: рабочие дни с понедельника по пятницу, рабочие часы – с 8 ч. 30 мин. по 19ч. 00 мин., суббота: рабочие часы – с 9ч. 00 мин. по 15ч.00 мин.,без обеда. Выходной день – воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске.

2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки.

3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса.

4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я.

5. 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса.

Цель проекта – строительство объекта «Многоэтажный жилом дом, не повышенной комфортности, с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса в городе Минске. 1-й этап (1-ый пусковой комплекс)».

с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения о сроках реализации:
Начало строительства – первое полугодие 2010 г.
Ввод объекта в эксплуатацию – второе полугодие 2012 г.

У Застройщика имеются:
- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство № 2565 от 30.10.2008 г.;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 04.12.2007 г. № 2685-5/07, от 14.01.2008 г. № 113-5/08, от 04.08.2010 № 859-15/10), государственную экологическую экспертизу (заключение № 239 от 30.08.2007 г., № 72 от 20.07.2010 г.);
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от «10» ноября 2010 г. № 2-203Ж-005/10(1).

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, пересечение пр. Дзержинского – пр. Жукова, в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:
По жилому дому:
1-комнатные – 4 шт.,
2-комнатные – 6 шт.,
3-комнатные – 4 шт.;

Цена одного квадратного метра в 1-комнатных квартирах общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **9 200 000** белорусских рублей (для лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

Цена одного квадратного метра в 2-комнатных квартирах общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **8 900 000** белорусских рублей (для лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

Цена одного квадратного метра в 3-комнатных квартирах общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **8 600 000** белорусских рублей (для лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

Данные о правах Застройщика на земельный участок:
земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 30.10.2008 г. № 2565 площадью 3,7474 га.

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию (1-го пускового комплекса) – 2-е полугодие 2012 г.

Сведения о договорах строительного подряда:
Договор подряда с ЗАО «Инсервисстрой» № 2-09 от 28.12.2009 г.

Условия ознакомления с информацией по проекту:
по тел.: 8 017 219 78 22, VELCOM 8 029 679 34 24; на сайте http://www.lada.by/ либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

Полное наименование и местонахождение покупателя акций: Маркаров Игорь Феликсович, г. Минск, ул. Козыревская, д. 16/29, кв. 23 (тел. 223 68 50).

Полное наименование и местонахождение брокера: частное унитарное предприятие по ценным бумагам «ЭСПАС», г. Минск, переулок Домашевский, д. 11А, ком. 710, тел. 213 58 55.

Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: открытое акционерное общество «Лошницкий комбикормовый завод», 222122, Борисовский район, д. Лошница.

Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель: не менее 11000 штук.

Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: минимальная цена — не ниже 10 000 руб., максимальная цена — не выше 500 000 руб.

Срок оплаты акций: не позднее дня, следующего за днем заключения сделки на ОАО «ББВФБ».

Форма и порядок оплаты акций: безналичное перечисление денежных средств в соответствии с правилами заключения сделок на ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Адрес, по которому будут заключаться сделки купли-продажи: ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 48а.

Дата начала срока покупки акций: 3 октября 2011 года.

Дата окончания срока покупки акций: 30 декабря 2011 года.

АБ ЗМЯНЕННІ ЗАКАНАДАЎСТВА ПА ПЫТАННЯХ ЗНЕШНЯЙ ПРАЦОЎНАЙ МІГРАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

З 12 ліпеня 2011 года ўвайшла ў сілу новая рэдакцыя Закона Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2010 г. «Аб знешняй працоўнай міграцыі».

У новым законе спрошчана прыцягненне замежнай рабочай сілы ў Рэспубліку Беларусь. Замест ліцэнзій на названы від дзейнасці ўведзены дазволы на прыцягненне замежнай рабочай сілы. У сферы працаўладкавання за мяжой садзейнічанне і абарона аказваюцца не толькі грамадзянам Рэспублікі Беларусь, але і іншаземным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ ГРАМАДЗЯН ЗА МЕЖАМІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Па-новаму рэгламентаваны парадак працаўладкавання грамадзян і іншаземцаў, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь. Законам упершыню вызначаны парадак працаўладкавання іншаземцаў, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Вызначана, што ўладкавацца на працу за мяжой грамадзяне і іншаземцы могуць альбо самастойна, альбо пры садзейнічанні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці, звязанай з працаўладкаваннем за межамі Рэспублікі Беларусь. У законе, які раней дзейнічаў, не аговорвалася магчымасць самастойнага працаўладкавання грамадзян Рэспублікі Беларусь за мяжой, хоць фактычна такое працаўладкаванне не забаронена і мае месца.

Для забеспячэння абароны Рэспублікай Беларусь праў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян і іншаземцаў, якія маюць дазвол на пастаяннае пражыванне ў Беларусі, самастойна выязджаюць за межы Рэспублікі Беларусь для працаўладкавання, прадугледжана, што гэтыя грамадзяне і іншаземцы маюць права да выезду з Рэспублікі Беларусь паведаміць падраздзяленню па грамадзянстве і міграцыі органа ўнутраных спраў па месцы жыхарства або месцы знаходжання аб выездзе за межы Рэспублікі Беларусь для працаўладкавання, а ў выпадку заключэння працоўнага дагавора ў Рэспубліцы Беларусь да выезду ў дзяржаву працаўладкавання — таксама пра тэрмін выезду, замежнага наймальніка, умовы працы і пражывання, уключаючы парадак аплаты працы і сацыяльнага забеспячэння.

На комплекснай аснове вызначаны абавязкі ліцэнзіятаў, патрабаванні да дагавора аб працаўладкаванні, да дагавора аб садзейнічанні ў працаўладкаванні, працоўнага дагавора. Выходзячы з патрабаванняў Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09.03.2005 г. № 3, вызначаны асаблівасці працаўладкавання па студэнцкіх праграмах.

Новаўвядзеннем з'яўляецца і тое, што працоўныя эмігранты, якія самастойна выязджаюць за межы Рэспублікі Беларусь для працаўладкавання і ажыццяўлення працоўнай дзейнасці, маюць права бясплатна атрымаць інфармацыю аб месцазнаходжанні і нумарах тэлефонаў дыпламатычных прадстаўніцтваў або консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь у дзяржаве працаўладкавання (пры іх наяўнасці), аб міжнародных арганізацыях, якія ажыццяўляюць абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў працоўных эмігрантаў у Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Зараз дзейнасць, звязаную з працаўладкаваннем грамадзян за мяжой, ажыццяўляюць 49 ліцэнзіятаў.

Тым, хто жадае працаўладкавацца за межамі Рэспублікі Беларусь, неабходна ведаць:

1. Публікацыя інфармацыйных (рэкламных) аб'яў аб магчымасці працаўладкавання за мяжой, у тым ліку і ў Расійскай Федэрацыі, без узгаднення з Дэпартаментам па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь не дапускаецца. У аб'яве павінна змяшчацца інфармацыя аб ліцэнзіі, выдадзенай Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. Працаўладкоўваць грамадзян за мяжой маюць права толькі тыя юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія маюць ліцэнзіі на гэты від дзейнасці.

3. Пры заключэнні працоўнага дагавора (кантракта) паміж грамадзянінам Рэспублікі Беларусь і замежным наймальнікам (пры працаўладкаванні студэнтаў у перыяд летніх канікул — паміж студэнтам і замежным наймальнікам або замежнай пасрэдніцкай арганізацыяй) неабходна ўважліва вывучыць і абмеркаваць умовы кантракта, што датычацца характару і месца аплатнай працы, тэрміну дзеяння кантракта, краіны працаўладкавання, умоў працы і яе аплаты, правоў і абавязкаў бакоў, умоў пражывання, харчавання, іншых сацыяльных гарантый, падстаў для скасавання кантракта і інш.

Адзін экзэмпляр працоўнага дагавора, зарэгістраванага ва ўпраўленні па грамадзянстве і міграцыі УУС аблвыканкама (ГУУС Мінгарвыканкама), выдаецца на рукі працоўнаму эмігранту перад яго ад'ездам на працу за мяжу.

4. Грамадзяне Беларусі, якія выязджаюць на працу за мяжу, абавязкова павінны мець рабочую візу дзяржавы працаўладкавання, выдадзеную яе дыпламатычным прадстаўніцтвам або консульскай установай (турыстычная віза не дае права працаваць).

5. Трымальнікі ліцэнзіі не маюць права спаганяць любыя віды перадаплаты за садзейнічанне ў працаўладкаванні да заключэння грамадзянінам працоўнага дагавора (кантракта) з замежным наймальнікам, замежнай пасрэдніцкай арганізацыяй або па іх даручэнні — з ліцэнзіятам, за выключэннем аплаты паслуг, аказаных у адпаведнасці з дагаворам аказання паслуг па працаўладкаванні, які заключаны ў пісьмовай форме з ліцэнзіятам.

Для таго, каб не трапіць у складаную сітуацыю і засцерагчы сябе падчас знаходжання за мяжой, усім, хто выязджае на працу за мяжу, неабходна мець з сабой копіі ўсіх дакументаў на выпадак страты арыгіналаў, страхоўку ад няшчасных выпадкаў і хваробы, пэўную суму грашовых сродкаў, кантактныя тэлефоны, уключаючы тэлефоны бліжэйшага дыпламатычнага прадстаўніцтва або консульскай установы ў краіне працаўладкавання.

За мяжой абарона правоў працоўных эмігрантаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы працаўладкавання і міжнароднымі дагаворамі. Практычную дапамогу, у выпадку неабходнасці, акажуць беларускае пасольства або консульства ў той краіне, куды выехаў наш грамадзянін. Акрамя таго, у многіх краінах ёсць прадстаўніцтвы Міжнароднай арганізацыі па міграцыі, адкрыты гарачыя інфармацыйныя лініі і кансультацыйныя цэнтры грамадскіх арганізацый па абароне правоў і інтарэсаў пацярпелых, звесткі пра якія можна атрымаць у ліцэнзіятаў, якія займаюцца працаўладкаваннем, або ў Дэпартаменце па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь.

ПРЫЦЯГНЕННЕ Ў РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ ЗАМЕЖНАЙ РАБОЧАЙ СІЛЫ

Пасля ўваходжання ў сілу закона (12.07.2011 г.) іншаземцы, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, могуць уладкавацца на працу да наймальніка Рэспублікі Беларусь не толькі самастойна, але і пры садзейнічанні юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў або замежных арганізацый, якія аказваюць паслугі па падборы персаналу.

Парадак аказання юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі паслуг па падборы персаналу вызначаецца пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2011 г. № 885 «Аб зацвярджэнні парадку аказання юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі паслуг па падборы персаналу з ліку замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь».

Акрамя таго, законам замацаваная норма пра тое, што наймальнікамі Рэспублікі Беларусь могуць з'яўляцца не толькі юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі або замежныя арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз прадстаўніцтвы, адкрытыя ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь або заканадаўствам замежнай дзяржавы дадзена права заключэння і спынення працоўных дагавораў з працоўнымі імігрантамі і якія выкарыстоўваюць працу працоўных імігрантаў на падставе заключаных з імі працоўных дагавораў, але і фізічныя асобы.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь можа ўстанаўліваць квоты на прыцягненне ў Рэспубліку Беларусь іншаземцаў, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, для ажыццяўлення працоўнай дзейнасці на яе тэрыторыі.

Ажыццяўленне працоўнымі імігрантамі працоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь дапускаецца ў адпаведнасці з палажэннямі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб знешняй працоўнай міграцыі» і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, калі заняцце свабодных працоўных месцаў (вакансій) не можа быць забяспечана грамадзянамі і іншаземцамі, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Працоўныя імігранты могуць ажыццяўляць працоўную дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь пры ўмове атрымання спецыяльнага дазволу і заключэння працоўнага дагавора.

Спецыяльны дазвол выдаецца іншаземцу, які не мае дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, па хадайніцтве наймальніка Рэспублікі Беларусь.

Пры ажыццяўленні працоўнай дзейнасці ў некалькіх наймальнікаў Рэспублікі Беларусь іншаземцы, якія не маюць дазволаў на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, абавязаны атрымаць спецыяльны дазвол для працы ў кожнага з іх.

Для выкарыстання працы іншаземцаў, якія не маюць дазволаў на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, у колькасці, якая перавышае дзесяць чалавек, наймальнік Рэспублікі Беларусь абавязаны атрымаць у Дэпартаменце па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь дазвол на прыцягненне замежнай працоўнай сілы.

Законам вызначаны пералік падстаў для адмовы ў выдачы або ануляванні дазволаў і спецыяльных дазволаў. Акрамя таго, прадугледжаны:

- абавязковыя патрабаванні да працоўнага дагавора, які заключаецца паміж працоўным імігрантам і наймальнікам Рэспублікі Беларусь;
- асноўныя гарантыі працоўным імігрантам пры ажыццяўленні працоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь;
- правы і абавязкі працоўнага імігранта і наймальніка Рэспублікі Беларусь.

Замацаваная норма, што тэрмін працоўнага дагавора з працоўным імігрантам не павінен перавышаць тэрміну дзеяння спецыяльнага дазволу.

Патокі працоўных эмігрантаў, якія выязджаюць з Беларусі, накіраваны як у блізкае, так і ў далёкае замежжа. У 2010 годзе выехала 5066 чалавек (у 2009 годзе — 4178 чалавек). Як і раней, у асноўным выязджаюць для працы ў Расію (3213 чалавек), ЗША (1259), Польшчу (292), Германію (130) і іншыя краіны. **За 6 месяцаў 2011 года выехала 2722 чалавекі.**

Пераважная большасць працоўных эмігрантаў выязджаюць на работы, звязаныя з фізічнай працай (будаўнічыя і сельскагаспадарчыя (збор ягад), на перапрацоўчыя прадпрыемствы), са сферай абслугоўвання (праца ў гасцініцах, на круізных лайнерах).

У 2010 годзе ў Беларусь на працу па кантракце прыбыла 6816 чалавек (у 2009 годзе — 4835). З краін СНД прыехалі ў Беларусь на працу грамадзяне Украіны (2731), Узбекістана (497), Малдовы (167), Арменіі (96), Азербайджана (89), Грузіі (29). З іншых краін у Беларусь прыбылі грамадзяне Літвы (1013), Турцыі (527), Кітая (512), В'етнама (188). **За 6 месяцаў 2011 года колькасць замежных грамадзян склала 5037 чалавек.**

Іншаземцы ў нашай краіне пераважна занятыя ў якасці будаўнікоў, сельскагаспадарчых рабочых, на пасадах кіраўнікоў, у якасці трэнераў, кухараў і па іншых спецыяльнасцях.

РПУП «Мозырский СДСК-1» проводит аукцион по продаже недвижимого имущества в процессе ликвидации
Имущество находится по адресу: Гомельская область, г. Мозырь

№ лота	Наименование объекта	Тип объекта	Общая площадь, м²	Оценочная стоимость (руб.)	Стартовая цена (руб.)	Сумма залога (руб.)
1	Главный производственный корпус	Здание одноэтажное, панельное	11988	3 098 583 000	2 478 867 000	125 000 000
2	Бетоносмесительный цех	Здание восьмиэтажное, панельное	1206	444 024 000	355 220 000	25 000 000
3	Административно-бытовой корпус	Здание трехэтажное, кирпичное с одноэтажной пристройкой	2267	523 581 000	418 865 000	27 000 000
4	Двухэтажное здание (бытовка)	Здание двухэтажное, панельное	471	140 787 000	112 630 000	9 000 000
5	Склад готовой продукции (открытый полигон)	Открытый полигон для хранения ж/б изделий	10080	1 265 129 000	1 012 103 000	51 000 000
6	Склад цемента	Здание одноэтажное, кирпичное, 4 ж/б емкости	215	486 855 000	389 484 000	26 000 000
7	Склад инертных материалов	Бетон, кирпич, шифер	1545	420 799 000	336 640 000	24 000 000

Продавец: РПУП «Мозырский СДСК-1».

Организатор аукциона: управляющий.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за объект.

Срок подписания договора купли-продажи объекта торгов – в течение 10 дней после дня проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления одним участником предмет торгов может быть продан участнику по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Форма, порядок оплаты: безналичный платеж на р/с № 3012265610018 ЗАО «Банк ВТБ (Беларусь)» г. Минск, Региональная дирекция № 100 г. Мозырь, БИК 153001108, получатель РПУП «Мозырский СДСК-1», УНП 400088810.

Сумма залога вносится на р/с № 3012265610018 ЗАО «Банк ВТБ (Беларусь)» г. Минск, Региональная дирекция № 100 г. Мозырь, БИК 153001108, получатель РПУП «Мозырский СДСК-1», УНП 400088810.

Документы, предоставляемые для участия в аукционе: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копия устава, доверенность представителю ю

Рыштаванні Бацькаўшчыны

БЕДНЫЯ АД БАГАТАЙ СПАДЧЫНЫ

Калі ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя, што ў Ляхавіцкім раёне разбурылі сядзібу XVII стагоддзя, то ў гэта цяжка было паверыць. Дом беларускага філосафа-мараліста Фларыяна Бохвіца ў в. Ураджайная (былыя Вошкаўцы) быццам бы ахоўваўся дзяржавай.

Фота Алеся ПІЗУНА.

Дом, якога няма.

На Ляхавіцкай зямлі шмат старадаўніх сядзібаў і паркаў, якія засталіся нам у спадчыну, але, на вялікі жаль, большасць з іх зараз знаходзяцца не ў лепшым стане. Патрэбны грошы, а іх, як заўсёды, не хапае.

У Вошкаўцах мне даводзілася бываць неаднаразова, бо яны знаходзіліся за некалькі кіламетраў ад нашай вёскі. Там была бальніца, і хворых часам на лячэнне клалі туды, а не ў райцэнтр.

Будынак, які выдаецца за дом Фларыяна Бохвіца, знаходзіўся на тэрыторыі Ураджайненскага палаца-паркавага ансамбля, які з'яўляецца гістарычна-культурнай каштоўнасцю.

Калі помнікі ў Грушаўцы, Начы, Савейках, Рэпіхаве (парк)..., нягледзячы на заняпад, усё ж захаваліся, то з домам Бохвіцаў некалькі іншая сітуацыя.

Але за лепшае будзе паслухаць **намесніка старшыні Ляхавіцкага райвыканкама Уладзіміра КРУКА**.

— Дом, пра які ідзе размова, не ўваходзіць у Спіс гістарычна-культурных помнікаў Беларусі, няма яго і ў Спісе мясцовых помнікаў.

— Але ж вісіць шыльда Міністэрства культуры...

— Ахоўваецца палаца-паркавы ансамбль. Млын захаваўся, цагляныя будынкі, парк...

— У такім разе чаму ўзняўся шум, што ў Ляхавіцкім раёне разбурылі сядзібу XVII стагоддзя?

— Неабходна было разабрацца, ці з'яўляецца той будынак сядзібай Бохвіцаў, а затым ужо падымаць шум.

Я разгарнуў «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», прысвечаны Брэсцкай вобласці, і там не ўпамінаецца пра сядзібу ў в. Ураджайная, а вось у кнізе «Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна» пра палаца-паркавы ансамбль у Вошкаўцах ідзе размова.

Дзіўна, у «Зборніку помнікаў» сядзібы Бохвіцаў няма, але ахоўная шыльда ёсць. Здарылася нестыкоўка, але спынімся на разбураным доме.

У будынку была амбулаторыя, і ён знаходзіўся на балансе Ляхавіцкай райбальніцы. Калі амбулаторыя пакінула гэты дом, ён прыйшоў у запусценне, бо за справу ўзяўся мясцовы люд: вынеслі і выламалі ўсё, што можна адарваць, — вокны, падлогу, дзверы. Будынак апынуўся ў аварыйным стане, і яго вырашылі знесці. Было адпаведнае рашэнне райвыканкама (ад 26.08.2008 г. №759), і восенню 2010 года дом разабралі на дровы для бальніцы.

Апошні раз я быў у в. Ураджайная тры гады таму, калі ездзіў па медыцынскую даведку на смерць бацькі, і мне ў галаву не магло прыйсці, што гэты казённы будынак сталінскай эпохі з'яўляецца шляхецкай сядзібай Бохвіцаў. Вельмі ж ужо бяздушная пабудова пад шыферным дахам. Не было ніводнага архітэктурнага элемента, за які зачапілася б вока. Сядзібу неаднаразова перабудоўвалі, і яна нясе ў сабе «характэрныя рысы часу эклектыкі». Але гэта яшчэ нічога не азначае. Будынак можа не быць помнікам архітэктуры, але мець адносіны да гісторыі.

Вось што пісала Эліза Ажэшка, калі ехала ў Вошкаўцы да Бохвіцаў:

«Праз тыдзень еду ў вёску, дзесьці на Навагрудчыне, чыгуначная станцыя Ляхавічы, маёнтак Фларыянаў, дзе буду піць нейкія воды і дыхаць свежым паветрам.

Не ведаю ні месца, ні людзей, да якіх еду, не ведаю, як мне там будзе. Гэта пансіянат, які прымае ўлетку гасцей за памяркоўную плату. Маляўнічага там, здаецца, нічога няма, але дом выгодны і вялізны парк. Прыезджых толькі 10 асоб, гэта не надта многа».

Вось вам і аграгурызм, над якім б'юцца нашы начальнікі. Неабходна фарміраваць чалавека і культурнае асяроддзе, а не зводзіць турызм на вёсцы да лазні і шашлыку з юшкай.

А што датычыцца разабранай сядзібы, то, на мой погляд, паспяшаліся з яе зносам. Неабходна было, найперш, дом абследаваць і ўстанавіць, якія фрагменты яго адносяцца да 19 стагоддзя, што засталося ад таго перыяду. Дах сучасны, вокны таксама. А сцены, столь? Нават цвік ці дзвярная ручка з мінулых эпох маюць каштоўнасць.

Даўно ў аварыйным стане сядзіба Рэйтанаў у Грушаўцы. Напэўна, і яе ў хуткім часе можна будзе пусціць на дровы?

У кожным раёне ёсць кіраўнікі, адказныя асобы, якія павінны адказваць за захаванне спадчыны, а не пускаць яе па графе «Аб дазволе спісання асноўных сродкаў». Атрымліваецца, што пад гэтую графу аднолькава можа падпадаць хлеў, разваленая лазня і былая сядзіба — помнік культуры.

Колькі ў нас за гады незалежнасці было адноўлена палацаў, замкаў? Многа. А вось да сядзіб, раскіданых па вёсках, рукі не дахо дзяць.

Неабходна зрабіць захады і прыняць закон, па якім сядзібы гэтыя можна было б прадаваць ці ўвогуле аддаваць за адну базавую велічыню пры ўмове, што новы гаспадар адродзіць помнік культуры, верне яму першапачатковы выгляд. А што ў той сядзібе будзе, нікога турбаваць не павінна: галоўнае — захаваць спадчыну.

Прасцей разводзіць рукамі і ўздыхаць, што помнік культуры ў аварыйным стане. А хто давёў сядзібы да такога стану?

Чаму мы бедныя пры такой вялікай спадчыне? А таму, што мы яе не бачым.

Калі не захаваем сваю культуру, то нам падкінуць іншую, чужую ці ўвогуле міфічную з мінулых тысячагоддзяў.

За сваё неабходна змагацца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Абзац

Гаспадаркі Беларусі ўбралі бульбу на 28 тыс.га, што складае якраз палову пасаджанай ў сельгасарганізацыях (57,5 тыс.га). Накапана 660,9 тыс.т бульбы пры сярэдняй ураджайнасці 228,9 ц/га, — гэта на 38,3 ц больш, чым летась. Самая высокая ўраджайнасць адзначаецца ў гаспадарках Магілёўскай вобласці: у сярэднім тут збіраюць па 272,4 ц/га. У Гродзенскай вобласці атрымліваюць 250,3 ц/га.

Прадпрыемствы Белкаапсаюза закупілі ў насельніцтва 440 т журавін, што ў 6 разоў больш, чым у аналагічны леташні перыяд. Нарыхтоўшчыкі пачыналі набываць журавіны па цане Br10 тыс. за кг, а цяпер выплачваюць насельніцтву Br15-20 тыс. за кг. Прадпрыемствы спажыўкааперацыі працягваюць таксама нарыхтоўку яблыкаў, восеньскіх грыбоў, дзікарослых ягад, чырвонай і чарнаплоднай рабіны, бульбы і агародніны. Яблыкі (апад) прымаюць па цане ад Br800 да Br1,5 тыс., таварныя яблыкі — ад Br3,5 тыс. да Br7 тыс., чырвоную рабіну — ад Br1,5 тыс. да Br2,5 тыс., чарнаплодную рабіну — ад Br2 тыс. да Br5 тыс., часнок — ад Br25 тыс. да Br30 тыс., моркву — ад Br900 да Br1,8 тыс., цыбулю — ад Br1,9 тыс. да Br3 тыс., буракі — ад Br800 да Br1,1 тыс., капусту — ад Br500 да Br800, бульбу — ад Br600 да Br1,3 тыс.

Продаж гарэлкі ў Беларусі сёлета ў студзені-жніўні вырас у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 14,8% да 7805,5 тыс. дал у натуральным выразе.

Сталічная міліцыя затрымала ашуканца, які прысвойваў буйныя сумы грошай сваіх ахвяр. 36-гадовы мужчына шукаў ахвяр з дапамогай аб'яў пра знаёмства. Як правіла, яго цікавілі дамы ва ўзросце 35-40 гадоў. «Кавалер», за плячамі якога ўжо мелася 7 гадоў калоніі, прадстаўляўся працаўніком банка і прапаноўваў дапамогу ў набыцці валюты. Так у кішэнях ашуканца аказваліся вялікія грашовыя сумы, з якімі ён тут жа знікаў.

Легендарная спявачка з Каба-Вердэ Сезарыя Эвора абвясціла аб завяршэнні музычнай кар'еры. Нядаўна 70-гадовая выканаўца прыбыла ў Парыж, каб даць серыю канцэртаў у Францыі. Аднак была настолькі слабая, што ў выніку вырашыла адмяніць канцэрты і спыніць заняткі музыкай.

Кватэрны злодзей затрыманы ў Фрунзенскім раёне Мінска. 33-гадовы жыхар Аксакаўшчыны, ужо судзімы за кватэрныя крадзяжы, сёлета з ліпеня па верасень абакраў некалькі кватэр па вуліцах Мазурава, Шаранговіча і Скрыпнікава. Падчас затрымання ў зламысніка адабрана 26 розных адмычак, нож і ліхтарык. З памяшканняў мужчына выносіў у асноўным грошы, ювелірныя вырабы, аргтэхніку невялікіх памераў.

Поўны абзац

Пры ўзвядзенні аднаго з аб'ектаў у жылым кварталe мікрараёна «Лебядзіны», які будуе кітайская кампанія BUCC, будзе ўжыта тэхналогія ацяплення памяшканняў за кошт ужывання энергіі падземных грунтавых вод. Па выніках гэтага эксперыменту будзе вырашана, ці варта яе распаўсюджваць пры будаўніцтве іншых аб'ектаў у Беларусі.

Урад ЗША за пяць гадоў выплаціў больш за 600 мільёнаў долараў памерлым пенсіянерам, якія раней былі на дзяржслужбе. У параўнанні з 2005 годам аб'ёмы памылковых выплат выраслі на 70%. Інспектар упраўлення кадравай службы заклікаў ведамства «раз і назаўжды пакончыць з растратай грошай падаткаплацельшчыкаў».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Зварот у карпункт

ВОСЬ І ДЗЕНЬ БЕЗ АЎТО!

У карпункт «Звязды» па Віцебскай вобласці звярнуўся чытач, якія паскардзіўся на тое, што 22 верасня, калі, нагадаем, праводзілася штогадовая міжнародная аперацыя «Дзень без аўто», ён у віцебскім рэйсавым аўтобусе № 26 не змог бясплатна даехаць дадому.

«А навошта тады рэкламаваць па тэлевізары дзень без аўтамабіля?» — задаў мне пытанне вадзіцель, «няўдалы пасажыр». Па словах мужчыны, кандуктар, калі ён паказаў вадзіцельскае пасведчанне, каб атрымаць права на бясплатны праезд (што і гарантавалася ў гэты дзень кіроўцам), толькі пасмяялася. Маўляў, гэта жарт і ніхто з начальства нічога ёй не расказваў «аб нюансах» абслугоўвання пасажыраў.

Карэспандэнт звязаўся з **намеснікам дырэктара па ідэалагічнай рабоце віцебскага «Аўтобуснага парка № 1» Эдуардам СЕВЯРНЁВЫМ**, які паабяцаў давесці да адказных асоб тое, што пачуў ад журналіста. Запісаў нумар аўтобуса і іншыя звесткі.

Можа, гэта і дробны факт, але ж насамрэч чалавек мае рацыю, калі хоча, каб тое, што абяцалі і рэкламавалі, выконвалася. Ці не так? Калі артыкул быў падрыхтаваны да друку, намеснік дарэктара паведаміў, што, з гарвыканкама атрымалі адпаведны ліст, у якім рэкамендавалася прадастаўленне бясплатнага праезду кіроўцам. Але ж улічваючы, што толькі за першыя восем месяцаў страты пры перавозцы пасажыраў склалі звыш 5,8 мільярда рублёў і, акрамя гэтага парк не даатрымаў каля мільярда рублёў, каб кампенсаваць пакупку гаруча-змазачных матэрыялаў, у парку не знайшлі магчымасці прадаставіць права бясплатнага праезду.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Шануй сваё!

СЕЛІШЧА — НАШ ГОНАР І СОРАМ

У Лагойскім раёне ёсць чатыры Селішчы. Тры з іх — вёскі. Яны пазначаны на пад'ездах і мясцовых картах і нават занесены ў спадарожнікавую сістэму каардынат. А вось урочышча з гэткай жа назвай паблізу Вялікіх Бясядаў застаецца невядомым і ніякім чынам не пазначаным. Адзіная адзнака, па якой можна арыентавацца ў пошуках гэтага куточка, — звалка-сметнік. Жыхары навакольных вёсак гэтак і кажуць: «Сметнік у Селішчы». Кажуць, не ўяўляючы, чым насамрэч з'яўляецца гэтае Селішча для нашай культуры. І якая абраза ўласнага гонару, калі на святых, па сутнасці, мясцінах утвараюцца палігоны бытавых адыходаў, кар'еры і проста сметнікі (несанкцыянаваныя). А можа, і ўяўляюць, і ведаюць, але абы-якавасць нярэдка робіць з чалавечай душой сваю ганебную справу. Мясцовыя ўлады пры гэтым робяць выгляд, што нічога не адбываецца.

Пра гэтае малавядомае ўрочышча Лагойшчыны сёлета згадвалася ў «Звяздзе» ў артыкуле «У пошуках Купалаўскіх хутароў» за 30 ліпеня. Так, гэта — Купалаўская зямля. Але якая! З 1895-га па 1904 год у гэтым куточку Мінскага павета жыла вялікая працавітая сям'я Дамініка і Бянігны Луцэвічаў — бацькоў будучага народнага паэта. Пасля нараджэння сына-першынца Яся Селішча было ніжнім шостым месцам арандатарства і жыхарства. У лёсе Янкі Купалы, як паэта, яно адыграла ці не галоўную ролю. Тут ён спасцігаў навуку сялянскай працы. Адсюль пайшоў па сапраўдныя веды ў Беларускае народнае вучылішча. Тут напісаў свой першы верш. У Селішчы прайшлі самыя прыгожыя гады Купалы — юнацкія. Тут яму споўнілася дваццаць. І хоць нідзе бацькам класіка нашай літаратуры лёгка не жылося, але Селішча аказалася неверагодна трагічным месцам у іхнім лёсе. А пражылі бацькі паэта разам усяго нічога — якіх 23 гады. У маі 1902 года тут памёр бацька Купалы Дамінік Ануфрыевіч. А ўвосень таго ж года адно за адным памерлі малодшы брат паэта Казік і малодшыя сёстры Сабіна і Гэля. Чатыры смерці самых блізкіх і дарагіх людзей на працягу паўгода! Гэта быў першы, але самы моцны ўдар у жыцці паэта. Большага гора ён ніколі ўжо не зведваў. Нават у жудасныя часы сталінскіх рэпрэсій і ў хвіліны развітання з радзімай на пачатку вайны не выпадала падобных выпрабаванняў. Але, як ведаць, ці не селішчанская зямля і тая трагедыя далі свету вялікага Купалу?

Сёння ў Селішчы нічога не сведчыць і нават не нагадвае пра сувязь гэтай зямлі з песняром. Ніякай шыльды, указальніка, дарожнага знака тут няма. Як, напрыклад, гэта зроблена ў Акопах. Адно шуміць вецер у купінцы дрэў на месцы колішняй сядзібы ды ўздымае пыл на ўзараным Луцэвічавым полі. Пакуль у Міністэрстве культуры ідзе абмеркаванне, як у наступным годзе шырока і гучна адзначыць 130-гадовы юбілей народнага паэта, у Селішчы тым часам ярудуюць чорнакапальнікі і з навакольных вёсак і дачных пасёлкаў на святую Купалаву зямлю звозяцца хлам і смецце.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Лагойскі раён.

СУМЛЕННАЕ ПАЛЯВАННЕ, альбо Самы вялікі трафей — з Беларусі

У разгары паляўнічы сезон на капытных. А ў ласёў і аленяў цяпер якраз гон, ці, прасцей кажучы, час вяселляў. Паляўнічым гэтая акалічнасць прыроды дапамагае здалёк убачыць жывёлу ў лесе і падкрасціся да яе. Фотапаляўнічым, да слова, таксама. І я, карыстаючыся момантам, адправіўся ў адну з лепшых паляўнічых гаспадарак на Магілёўшчыне — Шклоўскае таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Менавіта гэтым часам па добры ласіны трафей на Шклоўшчыну прыехаў нямецкі паляўнічы. І ў мяне з'явілася магчымасць даведацца крыху пра асаблівасці і адрозненні палявання ў нас і ў замежжы. Адольф Мецгер з ніжнесаксонскага горада Цыеле ўпершыню наведаў Беларусь і меў дастаткова часу — з добры тыдзень — папаляваць і паглядзець нашу краіну. Дагэтуль ён паляваў на лася ў розных краінах: Расіі, Англіі, Швецыі, Францыі, Нарвегіі. Пра такую магчымасць у Беларусі даведаўся выпадкова, наведаўшы аднойчы спецыялізаваную штогадовую выстаўку паляўнічых ў Гановеры. Моцна загарэўся — і запланаваў гэты прыезд. У вёсцы Калінаўка ёсць утульны гасцявы домік, у якім не сорамна прымаць і замежных гасцей. Адольф адчуваў сябе камфортна і, нягледзячы на тое, што некалькі дзён яму не шанцавала (не тое, што стрэліць, нават убачыць добрага беларускага лася-рагуля), нямецкі госць меў пазітыўны настрой. Яму падабаліся прагулкі па вёсцы і знаёмствы з яе простымі жыхарамі. Дарэчы, Адольф крыху валодае рускай мовай. У ягонай хатняй калекцыі ўжо было шэсць ласіных трафеяў — рогі з чэрапам, пра здабычу якіх ён з ахвотаю распавядаў за кубачкам кавы. Але ён яшчэ не ведаў, якая ўдача чакае яго літаральна ў бліжэйшы вечар.

Цікавыя акалічнасці высветліў я ў размовах з гэтым 67-гадовым аматарам палявання. Адольф ніколі не ставіць мэты любой цаной здабыць трафей. Па-першае, ён заўсёды прытрымліваецца правілаў палявання адразу дзвюх краін — сваёй і той, куды едзе паляваць. Напрыклад, у нашых правілах палявання ёсць дазвол выкарыстоўваць прыборы начнога бачання і светлавыя фары. І Адольф мог бы гэткай магчымасцю паспяхова скарыстацца. Але паколькі ў нямецкіх правілах такога дазволу няма, ён прынцыпова не ідзе на здзелку з сумленнем. Лічыць, што жывёлу трэба здабываць сумленна. Гэта значыць, умець падкрасціся, разгледзець магутнасць рагоў, прыкінуць, ці зможаш за іх заплаціць (трафеі вельмі дорага каштуюць) і толькі тады прымаць рашэнне на стрэл. Бывала, што, пераадолеўшы далёкі шлях і аддаўшы шмат грошай на дарогу, замежныя паляўнічыя вярталіся ні з чым. Ці ім сустракаўся не той трафей, ці гэткі, за які яны не маглі заплаціць. Мог без трафея застацца і нямецкі паляўнічы. Але зоркі былі на ягоным баку.

У той вераснёвы надвячорак Адольфа Мецгера забраў егер з самага далёкага ў раёне месца палявання. Пераадолеўшы на «УАЗе» кіламетраў з трыццаць і прайшоўшы пехатою яшчэ некалькі, паляўнічыя застаіліся на краі поля з канюшынай, куды штовечар збіраюцца маладыя і старыя ласі, самкі з ласянятамі. Ужо амаль сцямнела, калі метраў за сто пяцьдзясят з кустоўя паказаўся сілуэт магутнай жывёлы з неверагодным размахам рагоў — амаль як у аленя. Паляўнічы доўга ўзіраўся ў манокль свайго карабіна «Райфель» і ўсё ж вырашыў ціснуць на курок. Стрэл быў дакладны. Дарэчы, адзіны стрэл за ўсе дні палявання і знаходжання ў Беларусі! Пазней высветлілася, што гэты стрэл папоўніў ягоную калекцыю найлепшым трафеем па прыгажосці і вазе. Усе астатнія дні ён быў вельмі шчаслівы, хоць ягоных грошай не хапіла, каб адразу разлічыцца за трафей. Рогі аказаліся вагою ў 10 кілаграмаў 700 грамаў. Больш за чатыры тысячы еўра Адольфу прыйшлося ўсё ж пакінуць у Беларусі.

Пасля мы разам з ім хадзілі на мае фотапаляванні. Ён садзіўся на суседняй вышцы-засідцы, да цемры ўзіраўся і ўслухоўваўся ў цішыню лесу ці балота. Потым дзяліўся ўражаннямі, цікавіўся маімі поспехамі. Я не ўтойваў перад ім свайго шкадавання, што мне не ўдалося зрабіць фота здабытага ім лася. Але і ён, і я разумелі, што гэта паляванне і тут як каму пашанцуе. Але ж і мяне ўдача не мінала: у адну з раніц пашчасціла з блізкай адлегласці доўга здымаць магутнага лася з рагамі ажно на чатыры адросткі. Праўда, не без дапамогі егера, які сваім голасам здолеў прывабіць жывёлу на дзесяць метраў.

Можна доўга спрачацца пра гуманнасць падобных паляванняў, і тым больш з удзелам замежных аматараў. Але паляванне — спрадвечны і ці не самы старажытны занятак сапраўдных мужчын. Мне спадабалася, што замежны госць прадэманстраваў высокую культуру палявання і абсалютную цвярозасць у падыходзе да гэтай справы. А яму спадабаліся стаўленне і адносіны з нашага боку. І ён гэтага не ўтойваў.

— Наступны раз, — казаў шчаслівы Адольф, — я прывязу сюды шмат сваіх сяброў.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Лось, якога я фатаграфаваў на фоне жывёлагадоўчай фермы, быў таксама дастойны ўвагі і захаплення.

Немец-паляўнічы не паверыў сваім вачам, убачыўшы здабытага лася.

Адольф Мецгер думае, якім чынам ён зможа везці да хаты гэты амаль 11-кілаграмовы трафей.

Адна з простых тэхналогій ператварыць паляўнічы трафей у прыгожы сувенір.

Гучная справа

За дзень да тэракту Канавалаў праводзіў разведку на «Кастрычніцкай»

УЧОРА ў зале суда тыя, хто страціў у выніку выбуху ў метро сваіх родных, выказалі меркаванні адносна пакарання для абвінавачаных (у тым выпадку, калі іх віна будзе даказана).

Прыйшла на суд сястра мужчыны, які памёр у бальніцы праз два тыдні пасля таго страшнага выбуху.

— Брат вяртаўся дадому з працы. Як нам сказалі следчыя, ён трапіў у самы эпіцэнтр падзей і сваім целам накрыў двух чалавек. Не адразу памёр. Жыў яшчэ. Як жыў?.. Ляжаў у коме ў бальніцы. Страшныя былі траўмы...

Пасля пытання адносна меры пакарання прадстаўніца пацярпелага паглядзела на абвінавачваных і ціха сказала: «Самую строгую...»

— Я думаю, што гэта нелюдзі, куля ў лоб — гэта вельмі гуманна, — праз слёзы прамовіла жанчына, якая страціла ў той вечар сястру. — Яны павінны жыць у такіх клетках.

Прадстаўніца загінулай расказала, што сястру знайшлі ў тры гадзіны ночы ў моргу.

— Дадому штодзень сястра такім шляхам (маецца на ўвазе, на метро) не вярталася. Яе выбухам выкінула на рэйкі. Па ёй цягнік праехаў...

Варта таксама адзначыць, што большасць пацярпелых, якія ўчора давалі паказанні, не прад'явілі абвінавачваным матэрыяльных іскаў.

Акрамя таго, учора ў судзе перайшлі да даследавання рэчыўных доказаў па справе аб тэракце ў мінскім метро. У прыватнасці, паказалі відэазапісы камер назірання, якія размешчаны на чыгуначных вакзалах Віцебска і Мінска, а таксама камер сталічнага метро. На запісах можна падрабязна прасачыць за перамяшчэннем абвінавачваных 10 і 11 красавіка 2011 года. Ад выезду Канавалава з Віцебска раніцай 10 красавіка ажно да моманту выбуху.

У тым ліку прадэманстравалі, як Канавалаў ездзіў на разведку да месца плануемага выбуху ў «час пік» 10 красавіка. Як ён сам патлумачыў на адным з допытаў, для таго, каб выбраць для сябе бяспечнае месца. У прыватнасці, на відэа можна бачыць, як галоўны абвінавачваны ідзе па тунэлі з «Купалаўскай « на Кастрычніцкую» і прыпыняецца на выхадзе з яго. «Глядзіць на будучае месца закладкі бомбы», — пракаментаваў стоп-кадр дзяржабвінаваўца. Пакідаючы станцыю, ён таксама абарочваецца. На гэтым відэа Дзмітрый Канавалаў рухаецца надзвычай няспешна.

Акрамя таго, у судзе паказалі кадры з камер вонкавага назірання, якія ўсталяваны на вуліцах горада. На запісах відаць, што адразу пасля выбуху 11 красавіка Канавалаў выйшаў на вуліцу праз «Купалаўскую», праходзіў ля цырка, Кастрычніцкай плошчы, ратушы і ля іншых будынкаў. Усе кадры адзначаны таймерам.

Пасля прагляду відэазапісаў ва Уладзіслава Кавалёва запыталіся, ці пазнаў ён на кадрах камер назірання Дзмітрыя Канавалава. «Так, пазнаў», — адказаў ён. Пазнаў Кавалёў і сябе на тых кадрах, дзе разам з Канавалавым нясе сумку 10 красавіка. Сам жа галоўны абвінавачваны адмовіўся адказваць на аналагічныя пытанні дзяржабвінаваўцы.

Надзея ПАЎЛАВА.

МЗС: ПАСОЛ ПОЛЬШЧЫ Ў БЕЛАРУСІ НЕ ЗУСІМ ШЧЫРЫ Ў СВАІХ ЗАЯВАХ НАКОНТ БУДЫНКА ПАСОЛЬСТВА

Пасол Польшчы ў Беларусі Лешак Шарэпка не зусім шчыры ў сваіх заявах наконт будынка пасольства Польшчы ў Мінску. Аб гэтым гаворыцца ў каментарыі начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Беларусі Андрэя Савіных у сувязі з адпаведнай заявай польскага дыпламата аб сітуацыі з будынкам пасольства.

«На вялікі жаль, у сваіх заявах наконт будынка пасол Польшчы спадар Шарэпка моцна хітрыць», — гаворыцца ў каментарыі.

Польскі бок з поўным захаваннем усіх юрыдычных працэдур быў інфармаваны аб спыненні кантракта на арэнду будынка пасольства яшчэ 5 гадоў таму. У 2008 годзе польскаму пасольству быў выдзелены ўчастак зямлі ў прэстыжным месцы Мінска для будаўніцтва новага будынка. Польскі бок згадзіўся з гэтай прапановай і падпісаў адпаведны прававы акт. «Далей польскі бок проста не рабіў ніякіх бачных для нас дзеянняў», — падкрэсліваецца ў каментарыі прэс-сакратара.

«На жаль, мы ўсё часцей і часцей сутыкаемся з прыкладамі, калі за гучнымі фразамі і дэманстратыўнымі позамі польскай дыпламатыі хаваецца адсутнасць разважлівасці, а часам, як у гэтым канкрэтным выпадку, звычайная безадказнасць», — дадаў Андрэй Савіных.

ЯНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ НАМ УСВЯДОМІЦЬ НАША ШЧАСЦЕ

НЯДЗЕЛЬНЫ вечар, тралейбусны прыпынак на Нямізе... Аднекуль з боку царквы пад'язджае жанчына на інваліднай калясцы. Падыходзіць тралейбус, жанчына накіроўваецца да яго. Зразумела, што прыступак ёй не адолець. Побач стаіць купка хлопцаў, жанчына просіць іх дапамагчы. Двое падхопліваюць яе і ўцягваюць на заднюю пляцоўку тралейбуса. Потым выходзяць і, пераглянуўшыся, пачынаюць... гучна смяяцца. Дзверы зачыняюцца, тралейбус ад'язджае...

У аддзяленні дзённага знаходжання маладых інвалідаў Цэнтральнага раёна Мінска.

Я праводжу вачыма гэтую карціну: на зусім пустой задняй пляцоўцы тралебуса ў інваліднай калясцы самотна сядзіць жанчына. І мяне не пакідае думка: як жа яна выйдзе на патрэбным прыпынку, як дабярэцца да хаты?

Мы практычна ніколі не задумваемся аб інвалідах, калі толькі бяда не закранула нашу сям'ю. І калегі-журналісты пішуць пра іх таксама нячаста, успамінаючы аб існаванні гэтых людзей звычайна толькі да Дня інваліда ці тады, калі дзяржава прымае ў дачыненні да іх новы ўказ.

І наўрад ці хто-небудзь задумваецца, што добрага прыўносяць гэтыя людзі ў наша жыццё. Здаровым, каб адчуваць сябе шчаслівымі, патрэбныя кар'ера, грошы, забавы і яшчэ шмат чаго. Але не ўсё, што хочацца, нам даецца, і вось мы ўжо не задаволены сваім жыццём, у нас стрэс, неўроз, бяссонніца...

Атрымліваецца, што часам чалавеку, які завяз у дробных мітуслівых клопатах, каб зразумець, што, па вялікім рахунку, шчаслівы, трэба сустрэць юнака з ДЦП або бязногага інваліда. «Божа мой, і я яшчэ скарджуся, я яшчэ чымсьці незадаволены!». Калі сутыкаешся з людзьмі, якім жыць значна цяжэй, гэта не вырашае нашы праблемы, але вызваляе нас ад дробязнасці і дазваляе зірнуць на сябе і сваё жыццё ў іншым ракурсе.

У НАШАЙ КРАІНЕ 504.000 ІНВАЛІДАЎ.

«Некаторыя глядзяць на нас, быццам мы з нейкага іншага свету»

Здаровы чалавек баіцца апынуцца на месцы інваліда. Пры гэтым большасць з нас з цяжкасцю ўяўляе, як кантактаваць з інвалідам, баіцца зрабіць што-небудзь няправільна. Мы адчуваем няёмкасць, а часам і лёгкую паніку, калі ўпершыню ў жыцці размаўляем з чалавекам у калясцы або з невідушчым; не ведаем, як рэагаваць, калі аказваецца, што ў чалавека ёсць псіхічнае захворванне. Здаецца, такія людзі павінны вельмі моцна адрознівацца, што з імі трэба неяк інакш гутарыць. Толькі пры гэтым мы не ведаем як.

З-за невуцтва і забабонаў многія пачынаюць паводзіць сябе неадэкватна і нават па-хамску: спрабуюць каціць каляску без дазволу, напрыклад, а то і проста ставяцца пагардліва. Прычына ўсё тая ж: людзі думаюць, што інваліды — «іншыя». Але яны самі так не лічаць.

«Я проста чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, а ў цэлым такая ж, як усе», — усміхаецца інвалід па агульным захворванні Алена. «Некаторыя глядзяць на нас, быццам мы з нейкага іншага свету. Яны не разумеюць нас, пакуль самі не сутыкнуцца з бядой у сваім жыцці», — сумна кажа Дзяніс, які пакутуе на падучую хваробу.

Дарэчы, многія знакамітыя людзі былі інвалідамі. Напрыклад, Яраслаў Мудры. Летапісы не пакінулі падрабязнага апісання яго выгляду. Вядома толькі, што ён быў кульгавы: па адной з версій — з малых гадоў, па іншай — у выніку ранення ў адной з бітваў.

Мастак Барыс Кустодзіеў большасць сваіх палотнаў стварыў, будучы прыкаваным да ложка. Знакаміты партрэт Шаляпіна ў бабровым футры мастак пісаў па частках, не бачачы цэласнага твора. Шаляпін, дарэчы, лічыў гэты партрэт адным з найлепшых.

Меў інваліднасць і 32-гі прэзідэнт ЗША Франклін Рузвельт (у 1921 г. ён захварэў на поліяміэліт). Інвалідамі былі сляпы Гамер і глухі Бетховен, палкаводзец Міхаіл Кутузаў, вучоны і пісьменнік Юрый Тынянаў, сляпы музыкант Стыві Уандэр і многія іншыя вядомыя людзі...

Не прыніжайце іх жалем

— Як ставяцца да вас людзі на вуліцах, наколькі яны добразычлівыя? — пытаю я ў сваіх суразмоўцаў.

— «50 на 50, — адказвае Алена. — Ёсць добразычлівыя, ёсць — не вельмі. Некаторыя нават паказваюць пальцамі і рагочуць. Непрыемна адчуваць на сабе хуткія касыя позіркі, калі людзі тут жа адводзяць вочы. Часам дрэнна сябе адчуваю, трэба сесці ў аўтобусе — ніхто не саступіць месца. Хоць у мяне з-за захворвання вялікі жывот, я выглядаю як цяжарная. Ніколі не прашу сама аб дапамозе. Некаторыя дапамогуць, а потым упікнуць: маўляў, вам, інвалідам, яшчэ трэба дапамагаць. Чуць такое горка. Але стараюся не крыўдаваць, хоць часам не стрываю, слёзы на вочы наварочваюцца».

«Я баюся нарвацца на адмову, грубасць. Тыкаць сваім інвалідным пасведчаннем кожнаму чалавеку ў твар не будзеш, — умешваецца ў размову Дзяніс, — гэта ж не службовае пасведчанне...».

«У паліклініцы без чаргі бабулькі ніколі не прапусцяць, будуць стаяць намертва, — незласліва дадае Вольга, інвалід 2 групы (алігафрэнія). — А вось тыя, хто маладзей, бывае, прапускаюць...».

«Мы са сваімі падапечнымі час ад часу наведваем выставы, музеі, цырк, — распавядае загадчыца аддзялення дзённага знаходжання маладых інвалідаў Цэнтральнага раёна Мінска Тамара Грыдзюшка. — Часам прыходзіцца карыстацца грамадскім транспартам. Сядзяць здаровыя мужчыны, і ніхто не саступіць месца. Людзі паглядзяць — і тут жа адводзяць позірк убок...».

Але не трэба шкадаваць інвалідаў: з-за гэтага яны адчуваюць сябе ўшчэмленымі, працягвае Тамара Грыдзюшка. Сваю дапамогу трэба прапаноўваць тактоўна, размаўляць на роўных, бачыць у інвалідзе чалавека са сваімі асаблівасцямі.

Сярод інвалідаў, сапраўды, гэтак жа, як і сярод усіх астатніх людзей, ёсць далікатныя і нахабныя. Тут трэба паводзіць сябе проста: не выконваць лішніх патрабаванняў чалавека толькі з-за таго, што ён інвалід. Паглядзіце: ці справядлівыя яго патрабаванні? І ўжо пасля гэтага вырашайце, задавальняць або не задавальняць іх.

Калі вы не ведаеце, ці патрэбна інваліду дапамога ў нейкім канкрэтным выпадку, — спытайце яго самога. Рабіць гэта трэба ветліва, без лішняй драматызацыі. Напрыклад, калі вы ідзяце побач з інвалідам-калясачнікам і бачыце, што наперадзе перашкода, лепш загадзя спытаць, ці зможа гэты чалавек пераадолець яе, ці не патрэбна дапамога. Калі вы ідзяце ў госці да сяброў, у якіх ёсць дзіця-інвалід, лепш не выбіраць падарунак самому, а спытаць у іх, што прынесці.

Святлана БУСЬКО.

Работы інвалідаў.

ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ З ІНВАЛІДАМІ

— Калі вы сустракаецеся з чалавекам, які дрэнна бачыць або зусім сляпы, абавязкова называйце сябе і тых людзей, якія прыйшлі з вамі.

— Калі вы прапануеце дапамогу, чакайце, пакуль яе прымуць, а затым пытайце, што і як рабіць.

— Калі вы размаўляеце з чалавекам, які карыстаецца інваліднай каляскай або мыліцамі, размясціцеся так, каб вашы і яго вочы былі на адным узроўні, тады вам будзе лягчэй размаўляць.

— Памятайце, што інвалідная каляска — асабістая прастора чалавека. Не апірайцеся на яе, не штурхайце без дазволу. Пачаць каціць каляску без згоды інваліда — тое ж самае, што схапіць і панесці чалавека без яго дазволу.

— Калі вам дазволілі рухаць каляску, спачатку каціце яе павольна. Памятайце, што каляска імкліва набірае хуткасць, і нечаканы штуршок можа прывесці да страты раўнавагі.

Магчымасці абмежаваныя, жыццё поўнае

СЯМЕЙНАЯ пара Лена і Павел Ялховы прыязджаюць сюды амаль кожны дзень ужо чацвёрты год — з таго часу, як у 2007 годзе ў Цэнтральным раёне адкрылася аддзяленне дзённага знаходжання для маладых інвалідаў. Тут яны сустракаюцца з іншымі інвалідамі, займаюцца творчасцю. І сапраўды ведаюць, што іх ніхто і ні пры якіх абставінах тут не пакрыўдзіць і не асудзіць.

Яны і яшчэ 25 маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця да стварэння гэтага аддзялення проста сядзелі дома. Зараз яны з задавальненнем займаюцца ў розных гуртках: музычным, танцавальным, псіхалагічным, тэатральным, гуртку «Ачмурэлыя ручкі», рухальнай рэабілітацыі «Аранжавы настрой». Ёсць у аддзяленні і камп'ютарны клас, і жывы куток з марскімі свінкамі і мышкамі-пясчанкамі, і спартыўная зала, і пакой для рэлаксацыі са зручнымі крэсламі.

Загадчыца аддзялення Тамара Грыдзюшка распавядае пра сваіх падапечных з непрыхаванай сімпатыяй. Вось Іра Гурбік... Яна вельмі акуратная і адказная, калі ёй штосьці даручаць (напрыклад, працаваць у жывым кутку) — выканае заданне бездакорна. Гэты добры, сонечны чалавек ніколі не ўшчаміць нічыіх інтарэсаў. Сама можа пакрыўдзіцца, адвернецца, прыкрыецца локцем... але ненадоўга.

Саша Шухрай — спакойны, маўклівы, сарамлівы. Але вельмі добры. Тут ён адчувае сябе ў бяспецы і таму можа раскрыцца.

Оляй Цішаловіч тут нават трохі ганарацца. У Олі ў выніку захворвання моцна трасуцца рукі. І як жа яе мама была здзіўлена, убачыўшы, што яе дачку навучылі вышываць крыжыкам!

Тут завязваюцца сяброўскія і нават рамантычныя адносіны. Бо людзі з абмежаванымі магчымасцямі не менш, а то і больш за здаровых маюць патрэбу ў чалавечым цяпле.

11.00 Нерэальныя гульні.
11.30 Тэлепорт.
12.00 Гарачае кіно.
12.30 News блок Weekly.
13.00 «Канікулы ў Мексіцы».
16.00 Праверка чутак.
17.00 Тайн.net.
18.00 Шопаголікі.
19.00 Супердыскатэка 90-х.
22.30 Руская дзясятка.
23.20 World Stage.
0.10 Буду нараджаць.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Меладрама «Развітальныя гастролі».
7.45, 13.45 Навела «Жадаю вам...».
8.30 Фантастыка «Чалавек-амфібія».
10.30, 16.40 Дэтэктыў «Два доўгія гудкі ў тумане».
14.30 Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
18.30, 0.30 Камедыя «Чыча».
20.30, 2.30 Камедыя «Клуб жанчын».
22.55, 4.55 Дэтэктыў «Сышчык пецярбургскай паліцыі».

ДОМ КІНО

3.00 Новы хіт. Меладрама «Захоўвай мяне, дождж».
4.40 Трагікамедыя «Не бядуй!».
6.10 Меладрама «Сентыментальнае вандраванне на бульбу».
7.30 Трагікамедыя «Неверагодны заклад, або Праўдзівае здарэнне, якое паспяхова завяршылася сто гадоў таму».
8.45 Дэтэктыў «Сышчык».
11.00 Экранізацыя школьнай праграмы. «Інкогніта з Пецярбурга».
12.25 Камедыйны дэтэктыў «Шукайце жанчыну».
14.55 Трагікамедыя «Крыўда».
16.20 Камедыя «Беражыся аўтамабіля».
17.50 Гістарычная драма «Царскае паляванне».
20.00 Сусветная прэм'ера. Меладрама «Іронія ўдачы».
21.15 Мюзікл па-руску. «Дульсінея Табоская».
23.30 Фантастыка. «Маўчанне доктара Івенса».
0.50 Кінараман «Прызнанне ў каханні».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Сын палка».
6.05, 10.05, 14.05 М/с «Маўглі». «Зборнік м/ф «Нязнайка вучыцца». «Матыль».
7.00, 11.00 М/с «Апошні з магікан». 1 серыя. Казкі рускіх пісьменнікаў. «Жаба-падарожніца». Казкі народаў свету. «Карантышка — зялёныя штонікі».
8.00, 12.00 «Урокі цётачкі Савы». «Зборнік м/ф «Чалавек у паветры». «Стадыён шыварат-навыварат».
15.00 Маст. фільм «Мармуровы дом».
16.20 М/с «Маўглі». М/ф «Пра Пятрушку».
17.00 Фільм-казка «Падарунак чорнага ведзьмака».
18.00 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Пунсовая кветачка».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Перадзел. Кроў з малаком».
20.00, 2.00 Серыял «Абарона Красіна-3».
21.00, 3.00 Серыял «Сышчыкі-3».
22.00, 23.30 Серыял «Цішыня».

ТБ3

5.00 М/ф.
6.15 М/ф «Сябры анёлаў».
6.30 М/ф «Паляўнічыя на прывідаў».
7.00 М/ф «Бакуган».
7.30 М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
8.00 Серыял «Зена — каралева воінаў».
9.00 Маст. фільм «Ходзяць чуткі».
11.00 «Далёка і яшчэ далей».
12.00 Маст. фільм «Пекла ў паднябессі».
15.15 Серыял «Мерлін».
17.00 Здзіві мяне.
18.00 Маст. фільм «Кентэрвільскі прывід».
20.00 Маст. фільм «Трынацаць прывідаў».
21.45 Серыял «Прыцяжэнню насуперак». 1-я серыя.
22.30 Серыял «Камелот».
23.30 Маст. фільм «Апалуза».
1.45 Маст. фільм «Я — Сэм».
4.15 М/ф.

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Серыял «Франк Рыва».
10.45, 18.45, 2.45 Камедыя «Містэр Адзінота».
12.45, 20.45, 4.45 Драма «Ідзі і жыві».
15.15, 23.15, 7.15 Драма «16 кварталаў».

ТБ1000

3.00, 21.40 Драма «Фальшываманетчыкі».
5.00 Трылер «Балістыка: Экс супраць Сівер».
7.00 Камедыя «Запаведзі».
8.40 Драма «Заснежаныя кедры».
11.00 Драма «Краіна пагоркаў і далін».
13.00 Камедыя «Коткі супраць сабак».
15.00 Камедыя «Маска».
17.00 Камедыя «Дабіся поспеху».
19.00 Драма «Ночы ў стылі бугі».
23.20 Трылер «Эксперымент 2: Хваля».
1.10 Драма «Спакойны бацька».

DIVA UNIVERSAL

5.00 «Сапраўдныя хатнія гаспадыні

НЯДЗЕЛЯ, 2 КАСТРЫЧНІКА

ПЕРШЫ

6.20 Канцэрт «Залаты грамафон» (2009 г.).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40 Зброя.
9.55 Фартыфікацыя.
10.35 «Зямля беларуская». «Над Ушачамі восень плыве...».
10.50, 0.15 Серыял «Сваты-4».
12.10 Фільм — дзецям «Мэры Попінс, да пабачэння!».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Зорнае сяброўства».
16.25 Камедыя «Ванька Грозны».
18.10 Суперлато.
19.15 Камедыя «Там, дзе грошы».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Баявік «Моцны арэшак».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.05 «Фазэнда».
11.40 «Брэйн-рынг».
12.40 Меладрама «Мачаха».
14.20 Маст. фільм «Прывітанне, малы!».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Нядзельны «Ералаш».
16.30 Асяроддзе пражывання.
17.30 «Эстрадны кактэйль».
18.45 «Бітва тытанаў».
20.00 Контуры.
21.05 «Гордасць нацыі».
22.10 «Вялікая розніца».
23.15 Драма «Юлечка».
1.05 Камедыя «Рэцэпт яе маладосці».

ЛАД

6.40, 21.10 Камедыя «Агент 117: Місія ў Рыа».
8.25 «Правы чалавека».
8.40 Звон.
9.10 Мір вашаму дому.
9.20 Тэлебарометр.
9.25 Кінааповесць «Старшыня».
12.25 Кінапробы.
13.00 «Страсці па культуры».
13.45 Серыял «Маргоша».
17.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Тотэнхэм — Арсенал.
19.55 «Смешная часінка».
20.25 Навіны надвор'я.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
23.00 Камедыя «Пад замком».

СТБ

7.00 «Рэпарцёрскія гісторыі».
7.25 Маст. фільм «Бандыты».
9.30 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 «Вялікае сненданне».
11.30 Серыял «Салдаты. Дэмбельскі альбом».
13.20 «Прывітанне, доктар!».
13.55 Драма «Мой ласкавы і пяшчотны звер».
16.00 «Пяць гісторый».
16.30 «24 гадзіны».
16.55 Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «БАТЭ» — ФК «Гомель».
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Драма «Каралі Мамба».
22.40 «Прафесійны бокс».
23.35 Маст. фільм «Распусныя анёлы».
1.20 Серыял «Чаркізона. Аднаразовыя людзі».

МІР

5.00, 3.55 Дак. фільм «Інша-планецяне ўжо тут...».
5.50 «Смачны свет».
6.20, 2.50 Дак. фільм «Апалачы — бясконцы лес».
7.30 М/с «Прыгоды Мумі Троля».
8.30 «Давайце маляваць!».
8.45 «Спытай ва Усеведа».
9.00, 15.00, 2.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Ведаем рускую».
10.05 Серыял «Марш Турэцкага».
13.00 «Доказы віны».
14.00 «Правілы жыцця».
15.10 Маст. фільм «Гары, гары мая зорка».
17.00 Серыял «Каханне і іншыя глупствы».
20.00 Падагульняючая «Разам».
21.00 Маст. фільм «Матч поінт».
23.00 «Паўночнікі».
23.40 Маст. фільм «Маё апошняе танга».

8 КАНАЛ

9.00, 12.55, 18.45, 20.55, 23.40 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.25 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
9.30 «Мой любімы гадаванец».
10.00 «Кінаблакнот».
10.20 «Афармляем дзіцячы пакой».
10.30 «Адшукваецца адпачынак».
11.00 Камедыя «Жыццё, як яно ёсць».
13.00 Фантастыка «Зорныя войны-2».
15.20 «К-відэа» для дзяцей.
15.40 Фільм для дзяцей.
17.15 «Бульбокс».
17.45 Серыял «Думаць як злачынец».
18.50 Серыял «Каломба».
20.40 «Вечарніца».
20.55 «Надвор'е».
21.00 Драма «Сісі — мяцежная імператрыца».
22.50 «Інэт».
22.55 Серыял «Плашч».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 Серыял «Новая сямейка Адамс».
9.00 «Адны дома».
9.30 «Гэта маё дзіця».
10.30 Шоу «Украінскі квартал».
12.00, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 Серыял «Аманда О».
15.00, 23.00 «Гісторыя расійскага шоу-бізнэсу».
16.00 Шоу «Дзякуй Богу, ты прыйшоў!».
17.30 Серыял «Вароніны».
20.00 Шоу «Смех у вялікім горадзе».
21.00 «Добрыя жарты».
0.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «ХА».
7.20 Маст. фільм «Каханне прыходзіць не адно».
9.00 Серыял «Даішнікі. Працяг».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 Маст. фільм «Толькі ўдваіх».
13.30 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
14.15 «З новым домам!».
14.45 «Гарадок».
15.15 «Прышэльцы. Гісторыя ваеннай тайны».
16.10 Маст. фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
18.05 Вялікі святочны канцэрт.
21.05 Маст. фільм «Беспасажніца».
22.55 «Спецыяльны карэспандэнт».
23.55 Маст. фільм «Клінч».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

7.30 М/ф «Воўк і сямёра казлянят», «Бабуля Удава», «Як лячыць Удава».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «У зоне асаблівай рызыкі».
8.50 «Першая перадача».
9.20 «Ядзім дома!».
10.20 «Выратавальнікі».
10.55 «Дачны адказ».
12.00 «Развод па-руску».
13.20 Серыял «Адвакат».
15.05 «Крамлёўскія дзеці». «Людміла Касыгіна. Дачка чалавека ў масцы».
16.20 «Следства вялі...».
17.20 «І зноў прывітанне!».
18.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.50 «Цэнтральнае тэлебачанне».
21.55 «Філіп Кіркораў. Мая споведзь».
22.55 «НТБшнікі».
23.55 Маст. фільм «Урача выклікалі?».

ТНТ

5.00 М/с «Гэй, Арнольд!».
6.00 М/с «Як кажа Джынджэр».
7.25, 8.00 «Жаночая ліга».
7.55 «Лато Спорт Супер».
8.50 «Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00, 3.25 «Школа рамонту».
10.00 «СуперІнтуіцыя».
11.00 «Зарабіць лёгка-2». Дак. фільм.
12.00 «Папялушка. Перазагрузка».
12.30 «Шчаслівыя разам». 14.00 «Інтэрны».
15.30 «Гары Потэр і прынц-паўкроўка». Фэнтэзі.
18.30 «Універ».
19.00 «Пасейдон». Трылер.
21.00 «Камедзі Клаб».
22.00, 23.00, 2.25 «Дом-2».
23.30 «Горад грахоў». Баявік.
1.55 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
4.25 «Саша + Маша».

ІНТЭР+

7.40 Самы разумны.
9.05 Ілюзіі сучаснасці.
9.30 Школа доктара Камароўскага.
10.00 Ранішняя пошта.
10.30 Смачная ліга.
11.20 Арол і рэшка.
12.05 Дак. фільм «Queen. Рок па-каралеўску».
13.05 Купаж.
13.30, 23.30 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Ілічовец» — «Металіст».
15.30 Код доступу.
16.00, 1.15 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Шахцёр» — «Зара».
18.05 Серыял «Юрыкі».
18.30, 5.30 Маст. фільм «Мафія бессмяротная».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 3.45 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Ворскла» — «Дынама».
22.40 Дак. серыял «Месцы сілы».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
9.35 «Яна вас кахае?!». Маст. фільм.
11.00 «Легенды сусветнага кіно». Аляксандр Дзям'яненка.
11.30 «Прыгоды чарадзейнага глобуса, або Выхадкі ведзьмы». М/ф.
12.35, 0.55 «Прыцемкі гіганцтаў». Дак. фільм.
13.30 «Што рабіць?».
14.15 Опера «Пікавая дама».
17.20 «Мелодыі белай ночы». Маст. фільм.
18.55 «Шукальнікі». «Колькі каштавала Аляска?».
19.40 Вольга Аросева. Творчы вечар у тэатры Сатыры.
21.00 «Кантэкст».
21.40 «Гітара». Маст. фільм.
23.30 «Джэм-5».
0.35 «Абрабаванне па...-2». М/ф для дарослых.
1.50 «Чарлз Дзікенс». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Сустрэча з н.а. РСФСР Верай Васільевай». 1982 год.
6.40, 0.40 «Раферці». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Колба часу».
10.00 Па старонках «Кінапанарамы». 1989 год.
11.00 «Да і пасля...». Год 1990.
12.20 «Бліц». Канцэрт. 1990 год.
12.55 «КиВиН-90».
15.00 «Птушыны палёт». М. Жванецкі. 1990 год.
16.30 «Ты помнишь наши встречи...». Фільм-канцэрт. 1989 год.
17.00 «Вакол смеху». 1985 год.
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.10 «У гасцях у М. Магамаева». 1992 год.
20.00 «Быў час».
21.00 «Блакітны агеньчык». 1962 год.
21.55 «Крылатыя песні». 1967 год.
23.00 «Вяртанне...». Юрый Любімаў. 1989 год.
0.00 «Песні памяці маёй». Фільм-канцэрт.
4.00 «Тэма». 1993 год.

MTV

5.00, 1.00 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
8.45 «Губка Боб». М/ф.
10.00 News блок Weekly.
10.30 Ікона відэагульняў.
11.00 «13 кіналаж».
11.30, 21.40 Трэндзі.
12.00 Тайн.net.
13.00, 18.00 Шопаголікі.
14.00 «Канікулы ў Мексіцы».
17.00 Праверка чутак.
17.30, 21.10 Зоркі на далоні.
19.00 MTV Open Air.
22.10 Ноч на віле.
23.20 Пляж.
0.10 Буду нараджаць.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Камедыя «Чыча».
8.30 Маст. фільм «Майская ноч, або Тапельніца».
9.30 Навела «Вожык».
10.30, 16.55 Дэтэктыў «Сышчык пецярбургскай паліцыі».
14.30 Камедыя «Клуб жанчын».
18.30, 0.30 Драма «На сямі вятрах».
20.30, 2.30 Камедыя «Карнавал».
23.00, 5.00 Меладрама «Вочы».

ДОМ КІНО

3.00 Сусветная прэм'ера. Меладрама «Іронія ўдачы».
4.20 Дэтэктыў «Справа № 306».
5.40 Музычны фільм «Вышэй за вясёлку».
8.05 Камедыя «Летнія сны».
9.20 Новы хіт. Дэтэктыў «Геній пустога месца».
11.00 Экранізацыя школьнай праграмы. «Жаніцьба Бальзамінава».
12.25 Новы хіт. Містычны трылер «Па той бок ваўкоў». 1-я серыя.
15.45 Кінаальманах «Цалкам сур'ёзна».
16.55 Меладрама «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
18.10 Новы хіт. Драма «Не скажу».
20.00 Камедыя «Каханне і галубы».
21.40 Новы хіт. Меладрама «Кука».
23.25 Прыгодніцкі фільм «Хто заплаціць за ўдачу».
0.35 Кінараман «Візіт ветлівасці».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Мармуровы дом».
6.20, 10.20, 14.20 М/с «Маўглі». М/ф «Пра Пятрушку».
7.00, 11.00 Фільм-казка «Падарунак чорнага ведзьмака».
8.00, 12.00 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Пунсовая кветачка». Рускія народныя казкі. «Стары і журавель».
15.00 Фільм-казка «Пакуль б'е гадзіннік».
16.20 М/с «Маўглі». М/ф «Пазалочаныя лбы».
17.00 М/ф «Прыгоды чарадзейнага глобуса, або Выхадкі ведзьмы».
18.10 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Апошні пялёстак». М/ф «Без гэтага нельга».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Перадзел. Кроў з малаком».
20.00, 2.00 Серыял «Абарона Красіна-3».
21.00, 3.00 Серыял «Сышчыкі-3».
22.00, 23.30 Серыял «Цішыня».

ТБ3

5.00 М/ф.
6.15 М/ф «Сябры анёлаў».
6.30 М/ф «Паляўнічыя на прывідаў».
7.00 М/ф «Бакуган».
7.30 М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
8.00 Серыял «Зена — каралева воінаў».
9.00 Маст. фільм «Містэр Бонс-2: З мінулага ў будучыню».
11.00 Здзіві мяне.
12.00 «Разбуральнікі міфаў».
13.00 Маст. фільм «Кентэрвільскі прывід».
15.00 Маст. фільм «Трынацаць прывідаў».
17.00 Дак. фільм «Жонка па-руску».
18.00 Маст. фільм «Ходзяць чуткі».
20.00 Маст. фільм «Двайное бачанне».
22.00 Серыял «Прыцяжэнню насуперак».
23.00 Серыял «Сапраўдная кроў».
0.00 Маст. фільм «Я — Сэм».
2.30 Маст. фільм «Апалуза».
4.45 М/ф.

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Серыял «Франк Рыва».
10.50, 18.50, 2.50 Камедыя «Матадор».
12.35, 20.35, 4.35 Драма «Адзінокія сэрцы».
14.30, 22.30, 6.30 Драма «Масква».

ТБ1000

3.00, 21.20 Камедыя «Троцкі».
5.00 Драма «Ночы ў стылі бугі».
7.50 Камедыя «Коткі супраць сабак».
9.30 Камедыя «Маска».
11.20 Камедыя «Дабіся поспеху».
13.10 Прыгоды «Скубі-Ду».
14.50 Прыгоды «Касмічныя каўбоі».
17.10 Камедыя «Разумнікі».
19.00 Драма «Я — Сэм».
23.20 Драма «Спакойны бацька».
1.00 Камедыя «Сады ўвосень».

DIVA UNIVERSAL

5.00 «Дамы сям'і Гілмор».
9.10 «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Джэрсі».
10.00 «Нявеста для мільянера».
10.50, 17.30 Копы-навабранцы.
11.40 Камедыя «Мядовы месяц з мамай».
13.20 Маст. фільм «Дагавор на цяжарнасць».
15.00 Камедыя «Халасцяк».
16.40 «Пляткарка».
18.25 Камедыя «Вось такія пірагі».
20.00, 23.30 Камедыя «Бацькі».
1.00 «Шпік».
2.40 «Джордан расследуе».
3.30 Маст. фільм «Наваспечаны бацька».

РАМАНТЫКА

7.00, 18.40, 21.30, 00.55 «Без вестак зніклая».
7.55 «Тайна Лауры».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне».
13.20 «Доля-ліхадзейка».
19.35, 1.50 «Спакуснік».
22.25 «Падарожжа ў закаханасць».
0.00 «Неўтаймоўная Хільда».
2.40 «Паслухай, красуня».

AXN-SciFi

0.15, 5.00, 11.00, 23.15 Зоркі шлях.
1.00, 20.00 Стаўпы Зямлі.
2.55, 7.10, 16.50, 21.55 Фактар страху.
3.40, 8.45, 13.15 Зорны дэсант.
7.55, 16.00 Псі фактар.
9.30, 14.30 Гарады падзямелля.
14.00, 22.45 Страшна цікава.
17.45 4400.

20.40 ФІЛЬМ ДНЯ

«КАРАЛІ МАМБА» (ЗША—ФРАНЦЫЯ, 1992 г.)



У пачатку 50-х паехалі з Гаваны ў Нью-Ёрк два браты-музыканты, якія працуюць у стылі «мамба» — Нестар і Сесар. Яны паставілі перад сабой мэту — заваяваць сваёй музыкай Злучаныя Штаты.

Рэжысёр — Арн Глімчэр. **У ролях:** Арманд Асантэ, Антоніа Бандэрас, Кэці Марыарці, Пабла Каладжэра.

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

EUROSPORT

9.30 Снукер. Players Tour Championship.
11.15, 19.15, 0.00 Скачкі на лыжах з трамплінa. Летні Гран-пры.
12.45, 16.30, 1.15 Супербайк. Чэмпіянат свету.
14.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
15.15 Аўтаспорт. Аўта GP.
17.30, 20.15 Снукер. Players Tour Championship.
19.00, 2.15 Мотаспартыўны часопіс.
23.55 Мотаспорт. Лепшае ў серыі DTM.

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00, 18.00 Мегазаводы.
6.00 Самыя небяспечныя сустрэчы.
7.00, 13.00 Небяспечныя сустрэчы.
8.00 У пошуках акул.
9.00 На кручку.
10.00 Дэтэктывы-дайверы.
11.00 Аканіць неацэннае.
15.00 Мегапераезды жывёл.
19.00, 4.00 Цалкам сакрэтна.
20.00, 23.00, 2.00 Дзікая прырода Амазонкі.
22.00, 1.00 З пункта гледжання навукі.

DISCOVERY

8.00 Пятая перадача.
8.25 Як гэта зроблена?
8.50 «Як гэта працуе?».
9.15 Галаваломы.
10.10, 15.40 Разбуральнікі легенд.
11.05 Маланкавыя катастрофы.
12.00 Гіганцкія будоўлі.
12.55 У пошуках газу.
13.50 Брудная работка.
14.45 Смяротны ўлоў.
16.35 Амерыканскі чопер.
17.30 Заезды.
18.25, 7.00 Новы выклік Тайсана.
19.20, 2.40 Горш быць не магло.
20.15 Рачныя монстры.
21.10 Экстрэмальная рыбалка.
22.05 Небяспечнае ўзбярэжжа.
22.35 Бяспека меж.
23.00, 3.40 Нічога асабістага.
23.55, 4.40 Рос Кемп. Экстрэмальны свет.
0.50, 6.05 Моманты жаху.
1.45 Выкраданне і выратаванне.
5.40 Як гэта ўстроена?

ANIMAL PLANET

0.00 Падарожжа ў «Трабанце».
0.30 Падарожжы вакол свету.
1.00 Мараплаўцы.
2.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 21.00 Сусветны падарожнік.
6.00 Бясстрашныя падарожнікі.
7.00, 22.30 Пакаранне для абжоры.
7.30 Смак Грэцыі.
8.00 Блакітны кантынент.
9.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
11.00, 22.00 Шэф-кухар за мяжой.
12.00 Знаёмства з Токіа.
14.00 Падарожжа па Афрыцы.
18.00 Падарожжы гурмана.
20.00 Пра галоўнае.

TRAVEL

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25, 11.55 Паляўнічы на кракадзілаў.
8.15 Самае дзікае шоу.
8.40 Разбуральнікі стэрэатыпаў.
9.10, 16.30 Заасад Крыса Хамфры.
10.05 Коткі-прызёры.
11.00, 4.25 Уводзіны ў сабаказнаўства.
12.50 Акулы пад покрывам ночы.
13.45, 22,00, 2,35 Акулавае сямейства.
14.40 Выклік «Вялікай пяцёркі».
15.35 Дрэнны сабака.
17.25 Карына, дзікае сафары.
18.20 У нетрах Афрыкі.
20.10 Перакладчык з сабачай.
21.05, 1.40 Паветраныя скіяўцы.
22.55, 3.30 Кітовыя войны.
23.50 Небяспечныя маршруты Макса.
0.45 Дзікія і небяспечныя.
5.20 Паліцыя Фенікса: аддзел па абароне жывёл.
6.10 Заатур Мікаэлы.

ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Гісторыя хвароб.
5.40, 20.40 Цяга да жыцця.
6.30, 21.30 Школа розуму.
7.10, 14.00, 22.10 Генезіс здароўя.
8.00 Я перамог гэты боль.
8.40, 23.40 Зялёная аптэка.
9.20, 0.20 Метэазалежнасць.
9.50, 18.20, 0.50 Шлях да здароўя.
10.30, 1.30 Жаночае здароўе.
11.00, 2.00 Пачуцці чалавека.
11.40, 20.40 Элемент здароўя.
12.20, 3.20 Я расту.
12.50, 3.50 Спорт для дзяцей.
13.30 Алергія.
14.50 Цела чалавека.
15.30 Што мы носім?
16.10 Дыялогі пра харчаванне.
17.00 Праўда пра пахудзенне.
17.40 Мужчынскія сакрэты.
18.45 Азбука здароўя.
18.50 Найноўшыя дасягненні.
19.30 Зона рызыкі.
23.00 Практыка здароўя.
4.30 Як Вы сябе адчуваеце?

ТДК

6.00, 7.50, 13.00, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 14.30, 21.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00, 23.45 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
13.30, 2.00 Нашы дзеці.
15.30 Латарэя «Бінга».
19.00, 22.50, 4.00 Люстэрка жыцця.
22.00, 0.05 Сэксуальная рэвалюцыя.
1.00 Твой дом.
3.00 Маст. фільм.

УНП 391000431
Организация купит рапс в неограниченном количестве.
Цена договорная.
Тел. (8 029) 676 45 97, (8 029) 623 14 80

Інфарм-укол

ЗАХАВАННЕ ЛІБІДА — НЕ ПРЫКМЕТА МАЛАДОСЦІ

Зніжэнне лібіда і патэнцыі ў пажылых узнікае далёка не заўсёды і ў большай ступені абумоўлена не ўласна ўзростам, а хваробамі і сацыяльнымі змяненнямі. Прыкладна ў чвэрці мужчын пасля 65 гадоў лібіда і патэнцыя не зніжаны.

У грамадскім меркаванні існуе ўяўленне аб больш раннім і хуткім старэнні жанчын, паколькі ў іх больш рана спыняецца дзетародная функцыя і зніжаецца сэксуальная прывабнасць. Сапраўды, звычайна ва ўзросце ад 48 да 53 гадоў 90 працэнтаў жанчын адзначаюць характэрныя для менапаўзы сімптомы — прылівы гарачыні, патлівасць, змяненне колеру скуры, іншую сасудзістую сімптаматыку, што звязана са зніжэннем функцыі яечнікаў. Адначасова прыкладна ў трэці жанчын у гэты перыяд з'яўляюцца стомленасць, трывожнасць, раздражняльнасць, напружанасць, эмацыйная няўстойлівасць, неглыбокая дэпрэсія, парушэнні сну. Варта заўважыць, што завяршэнне рэпрадуктыўнага ўзросту нярэдка з'яўляецца для жанчыны псіхатраўмуючым фактарам, паколькі нагадвае пра ўзрост, набліжэнне старасці, страту сэксуальнай прывабнасці і ранейшай фізічнай формы. Акрамя таго, жанчына часта перажывае дадатковы стрэс, звязаны з выходам з дому дарослых дзяцей ці хваробай або смерцю бацькоў. Вядома, што псіхічныя расстройствы ў перыяд менапаўзы цяжэй працякаюць у жанчын з заніжанай самаацэнкай і дрэннай сацыяльнай адаптацыяй. Верагоднасць іх узнікнення тым вышэй, чым больш канфліктаў мелі месца ў ранейшыя крытычныя перыяды жыцця жанчыны — падлеткавы ўзрост, замужжа, цяжарнасць, нараджэнне дзяцей.

Жаночае завяданне нярэдка суправаджаецца «маскулінізацыяй»: агрубленнем голасу, рысаў твару, змяненнем фігуры, хады, жэстаў, з'яўленнем валасоў на падбародку і верхняй губе. Аднак біялагічна жанчыны старэюць больш павольна. Аналагічныя вымярэнні ў тканках старых жанчын і мужчын надыходзяць у апошніх раней на 8 гадоў, а значыць, біялагічнае старэнне жанчын адбываецца пазней. Высокая жыццяздольнасць жанчын захоўваецца на працягу ўсяго іх жыцця, а спыненне дзетароднай функцыі — гэта свайго роду адаптацыя, абарона арганізма, які старэе, ад ужо непасільнай для яго нагрузкі, звязанай з цяжарнасцю і родамі. «Жаночае завяданне» абумоўлена паніжэннем абарончай функцыі жаночых палавых гармонаў — эстрагенаў, якія аказваюць антысклератычнае дзеянне. Пасля клімаксу ў жанчын хутчэй развіваецца атэрасклероз. Такім чынам, ранняе «адцвітанне» жанчын не зусім адпавядае іх агульнаму старэнню.

У мужчын завяданне менш выразнае і расцягваецца на большы тэрмін, але яно раўнамерна падводзіць да старэння ўсяго арганізма. Таму мужчыны даўжэй захоўваюць свой рэпрадуктыўны патэнцыял і выглядаюць маладзейшымі. Аднак гэтае захаванне сэксуальнай здольнасці не распаўсюджваецца на сапраўдную жыццяздольнасць арганізма: у іх мацней выражаныя склератычныя працэсы, больш высокі біялагічны ўзрост, а вось агульныя жыццёвыя шанцы ніжэй, чым у жанчын аналагічнага ўзросту.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

26 верасня — галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі Андрэй Міхайлавіч МАТВЕЕЎ.

27 верасня — намеснік начальніка ўпраўлення фармацэўтычнай інспекцыі Міністэрства аховы здароўя Ала Мікалаеўна ДАЛГОЛІКАВА.

28 верасня — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач горада Мінска Іван Іванавіч ВАЙТОВІЧ.

29 верасня — галоўны спецыяліст аддзела медэкспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Ірына Аляксандраўна КІРЭЕВА.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (220 20 25)

26 верасня — загадчык нефралагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Ірына Казіміраўна РУБАН.

27 верасня — загадчык афтальмалагічнага аддзялення для дзяцей Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ларыса Паўлаўна МАКАРАВА.

28 верасня — урач-псіхіятр арганізацыйна-метадычнага кансультацыйнага аддзела Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя—наркалогія» Таццяна Віктараўна ПЛАКСА.

29 верасня — загадчык уралагічнага (андралагічнага) аддзялення №2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр Мікалаевіч ВАСЮКЕВІЧ.

Прышчэпка супраць грыпу — рэальны клопат кіраўніка аб падначаленых

Па афіцыйных звестках Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у верасні актыўнасць грыпу на еўрапейскім кантыненце заставалася нізкай. Выяўленыя і даследаваныя дагэтуль вірусы грыпу адпавядаюць тым, што былі рэкамендаваны для іх уключэння ў склад процігрыпозных вакцын для жыхароў Паўночнага паўшар'я на эпідсезон 2011—2012 гадоў. У Беларусі таксама ўзровень актыўнасці вострых рэспіраторных інфекцый застаецца пакуль нізкім. У краіне працягваецца кампанія па вакцынацыі насельніцтва супраць грыпу. У сталіцы прышчэпленыя ўжо больш як 100 тысяч мінчан. А ўсяго ў горадзе плануецца абараніць ад грыпу з дапамогай прышчэпак не менш як 330 тысяч працуючых мінчан: 185 тысяч чалавек за кошт бюджэтнага фінансавання і каля 145 тысяч — за кошт сродкаў прадпрыемстваў.

Летась у Мінску прышчэпкі ад грыпу зрабілі больш як 393 тысячы чалавек, або 22 працэнты ад агульнай колькасці гараджан. У тым ліку прышчэпкамі былі ахоплены 260 тысяч работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый, што дазволіла папярэдзіць сярод працуючых мінчан 30,5 тысячы выпадкаў захворвання на грып і больш як 9 тысяч выпадкаў захворванняў на іншыя вострыя рэспіраторныя інфекцыі. А эканамічны эфект ад праведзенай вакцынацыі ацэньваецца ў суму 10 мільёнаў долараў ЗША. Сёлета пастаўлена задача ахапіць прышчэпкамі ад грыпу не менш як 30 працэнтаў жыхароў сталіцы, або не менш як 560 тысяч мінчан. Па стане на сярэдзіну верасня кіраўнікі 254 сталічных прадпрыемстваў і арганізацый ужо арганізавалі вакцынацыю сваіх супрацоўнікаў. Актыўна вядзецца вакцынацыя работнікаў прадпрыемстваў «Спецкамунаўтатранс», гандлёвага дома «Гаспадар», завода вінаградных він, Дома друку, Мінскага аўтазавода, вытворчых аб'яднанняў «Інтэграл» і «Керамін», навукова-вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі, Мінскага механічнага завода імя Вавілава.

Як сцвярджаюць спецыялісты сталічнай санэпідслужбы, вынікі шматгадовага навукова-практычнага даследавання сведчаць, што выкарыстанне вакцыны для папярэджання грыпу забяспечвае зніжэнне захваральнасці ў рабочых калектывах больш чым утрая і зніжэнне працягласці часовай страты працаздольнасці сярод прышчэпленых больш чым у 4,5 раза. Аналіз звестак за 2010 год паказаў, што без правядзення вакцынацыі паказчыкі захваральнасці з часовай стратай працаздольнасці ў асобных будаўнічых арганізацыях у 2,3—3 разы перавышалі сяроднегарадскія, у той час як ахоп вакцынацыяй супраць грыпу ад 37 да 40 працэнтаў работнікаў у іншых будаўнічых арганізацыях дазволіў знізіць там паказчыкі захваральнасці з часовай стратай працаздольнасці ў 1,5-2 разы.

Верасень, кастрычнік і лістапад лічацца аптымальным часам для правядзення вакцынацыі супраць грыпу, нагадваюць спецыялісты.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сам сабе псіхолаг

14 КРОКАЎ ДА WORK-LIFE БАЛАНСУ

«ЧАЛАВЕК па-сапраўднаму шчаслівы, калі раніцай ён з радасцю ідзе на працу, а вечарам з радасцю ідзе дадому». Гэта простая, усім вядомая ісціна. Але як складана трымацца яе ў штодзённым жыцці! Пастараемся вывесці «формулу шчасця» ці, дакладней, сакрэт раўнавагі паміж працай і асабістым жыццём.
Упершыню паняцце «work-life balance» (баланс працы і асабістага жыцця) было выкарыстана напрыканцы 1980-х гадоў у дачыненні да жанчын, якія працуюць. Навукоўцы тады даказалі, што дысбаланс паміж працоўным і асабістым часам нярэдка прыводзіць да эмацыйнага выгарання, хранічнай стомленасці, псіхічных парушэнняў. Як жа захаваць гэты каштоўны баланс і, як вынік, здароўе?

ЯК «ЛЯЧЫЦЬ»?

1. Пакіньце працу за парогам.

Нават самай любімай працы не варта прысвячаць 24 гадзіны ў суткі. (Нездарма ж у народзе кажуць: перш папрацуй, а тады і патанцуй.) На жаль, многія думаюць пра яе і тады, калі працоўны дзень ужо даўно закончыўся. Сям'я сабралася за агульным сталом, а вашы думкі ўсё яшчэ лунаюць вакол будучай здзелкі. Каб гэтага не адбылося, навучыцеся пераключацца. Якой бы важнай ні была праца — яна не заменіць стасункі з блізкімі.

2. Раўнавага спраў.

Вы сапраўды хочаце збалансаваць працу і асабістае жыццё? Тады прызнайце: абедзве сферы аднолькава важныя. Не варта аддаваць перавагу адной на шкоду другой.

3. Калі «Не» на карысць.

Часам бывае цяжка адмовіць сябру, партнёру. Так хочацца заставацца «добрым» у вачах іншых. Аднак зусім не абавязкова станавіцца агрэсіўным, адказваючы «не». Можна навучыцца вымаўляць гэтае слова мякка, але настойліва. І тады вы будзеце абаронены ад многіх сямейных канфліктаў, вытокі якіх ляжаць у няўвазе і немагчымасці правесці больш часу ў родных сценах.

4. Два ў адным.

Нярэдка сустракаюцца справы, якія на першы погляд маюць падабенства, але адносяцца да розных сфер жыцця. Альбо хатнія і працоўныя планы перасякаюцца па часе. Ёсць магчымасць — рабіце іх адначасова. Напрыклад, складаеце дзелавое пісьмо — адпраўце і сябру вестачку па электроннай пошце.

5. Вядзіце запісы будучых спраў.

Плануйце працоўны дзень і фіксуйце запісы на паперы. Правільна ж кажуць: «Дрэнны аловак заўсёды лепш, чым добрая памяць». Пры неабходнасці бягучы спіс заўсёды можна абнавіць. Затое вы будзеце спакойныя: займаючыся асабістымі справамі, вы ўжо не будзеце засяроджваць увагу на чымсьці, калі раптам успомніцца нешта важнае адносна працы.

6. А ці варта аб працы гаварыць?

Не бойцеся распавядаць у сямейным коле пра свае перамогі і паражэнні, кар'ерны рост, бліжэйшыя перспектывы. Вядома, не варта гаварыць пра гэта кожны дзень. Але зрэдку дзелячыся са сваякамі часткай свайго «офіснага» жыцця,

МАСАВЫ ГАНДАЛЬ «ЭЙФАРЫЙНЫМІ ПАРАШКАМІ» ПРАЗ БЕЛАРУСКІ ІНТЭРНЭТ ПРАЦЯГВАЕЦЦА?

Новыя і новыя небяспечныя рэчывы з моцным псіхатропным эфектам працягваюць завозіць у Беларусь. І свабодна прадаваць праз інтэрнэт.

«Лечаць прастуду, санлівасць, можна не спаць да сямі сутак», — адкрыта рэкламуюць барыгі свае парашкі ў сацыяльных сетках.

Ці шмат у беларускім інтэрнэце суполак, прысвечаных «парашкам», «міксам», «солям»? Пра гэта ў матэрыяле «Звязды».

Увесну на старонках нашай газеты выйшла журналісцкае расследаванне *«Як барыга прадаваў мне «эйфарыйны парашок» (нумар за 24 мая 2011 года)*.

У матэрыяле апавядалася пра тое, як журналіст пад выглядам наркаспажыўца набыў паўграма невядомага белага парашку. Аб'ява барыгі і яго нумар тэлефона былі размешчаны ў сацыяльных сетках.

— Я першы раз перабраў, мяне вынесла на... — так падчас кантрольнай закупкі прарэкламаваў якасці свайго тавару барыга Сяргей.

Пры дапамозе Міністэрства ўнутраных спраў «эйфарыйны парашок» быў здадзены на экспертызу ў Дзяржаўны экспертна-крыміналістычны цэнтр.

Рэчыва, якое прадаў барыга, аказалася метаксетамінам. Ужыванне такога парашку магло прывесці да маній, дысацыяцый і іншых псіхічных расстройстваў.

Як нам патлумачыў **дацэнт кафедры псіхіятрыі і наркалогіі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр БАГДАНАЎ**, ад спажывання такіх «парашкоў», «соляў» і «міксаў» могуць узнікаць парушэнні псіхічнай дзейнасці: *«І часам на тое, каб вярнуць пацыента да рэчаіснасці, патрэбна нямала часу. Псіхалагічная залежнасць застаецца, і яна настолькі моцная, што чалавек часам не можа сябе кантраляваць»*.

Падкрэслю, што на момант кантрольнай закупкі метаксетамін не быў унесены ў «Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў». Гэта агульнасусветная праблема. У наркалабараторыях штотыдзень «штампуюць» новыя і новыя псіхатропы. І да такой аператыўнасці заканадаўствы розных краін, у тым ліку і нашай, папросту не гатовы.

Што тычыцца Беларусі, у нас «парашкі», «солі», «міксты» і іншыя сінтэтычныя пісхатропы ўносяцца ў наркатычныя спісы перыядычна. І калі абмежаваць дзейнасць барыг у інтэрнэце (а ў аб'явах наўпрост пазначаны нумары тэлефонаў, цэны і нават часам выстаўлены рэальныя фотаздымкі наркагандляроў), то аб'ёмы распаўсюджвання небяспечных для псіхікі грамадзян рэчываў можна было б істотна зменшыць.

Праз тры месяцы пасля выхаду журналісцкага расследавання мы вырашылі праверыць, ці былі зроблены высновы з нашага матэрыялу. Ці навялі парадак у інтэрнэце?

Праглядаючы самую папулярную сярод моладзі сацыяльную сетку vkontakte.tu, мы па адным Мінску налічылі... 26 (!) суполак, праз якія адкрыта прапаноўваюць «солі», «міксты», «парашкі», «араматызатары» і іншае (сітуацыя на 23 верасня 2011 года, інфармацыя пра ўсе суполкі зафіксавана і знаходзіцца ў рэдакцыі). Кожная суполка — гэта паўнавартасны інтэрнэт-сайт, з фотаздымкамі тавараў, з беларускімі нумарамі тэлефонаў барыг.

26 — гэта лічба толькі па Мінску і толькі па запыце «парашок». Суполкі створаны і пад іншыя абласныя і раённыя цэнтры. Каб праглядзець усе прапановы, трэба патраціць, напэўна, дзень.

Тэлефаную па першым нумары, які мне патрапіўся.

— Здароў, колькі каштуе «полка» (паўграма)?

— Полка — 50 будзе (доларaў).

— Я знаходжуся ў цэнтры, як бы нам сустрэцца?

— Магу пад'ехаць на машыне, якраз і я тут непадалёк.

— Калі?

— Ну, б..., магу хвілін і праз 20 быць у цэнтры. Дам на пробу, калі хочаш. Нармальная штука.

Вось так проста.

Набіраю другі нумар — занята. Неўзабаве барыга ператэлефаноўвае сам:

— Званілі?

— Званіў. Колькі каштуе «полка»?

— 50.

— Чаму так дорага?

— Якасць. За якасць трэба плаціць. Людзі плацяць за якасць. Затое, б....., там будзе не анальгін таўчоны, а там будзе нешта такое, ну, нармальнае... У тым жа інтэрнэце ты за 30 ці за 40 можаш купіць анальгін таўчоны. Так што глядзі сам, можа, варта заплаціць на 10 доларaў больш, але ўзяць нешта якаснае...

Праўда, некаторыя барыгі паводзяць сябе не так нахабна і хаця б мінімальна канспіруюцца. Так праз сацыяльную сетку гандляр пад мянушкай Федзя Міксовы пакінуў мне інструкцыі, як набыць яго тавар:

«Аплата на мабільны тэлефон. Аператар «Білайн». Потым даём мінскі адрас. Едзеце і забіраеце...»

Хто павінен кантраляваць нахабства барыг у інтэрнэце?

Пасля выхаду любога расследавання «Звязды», звязанага з наркотыкамі і псіхатропамі, крытыка чытачоў заўжды накіравана на міліцыю.

Аднак, калі паглядзець на справу аб'ектыўна, то ў плане барацьбы з распаўсюджваннем наркотыкаў менавіта МУС робіць самыя грунтоўныя крокі.

Прызнаны міжнародны супольнасцю факт, што ў пытанні забароны сінтэтычных псіхатропаў Беларусь уваходзіць у дзясятку самых перадавых краін свету! Уявіце, які гонар гэта рабіла б нашай праваахоўнай сістэме, калі б не бяздзеянне некаторых іншых структур. Шэраг ведамстваў у сваіх справаздачах рапартуе пра ўласны ўнёсак у барацьбу з нарконаркотыкамі. Але што гэта за ўнёсак, калі дзясяткі барыг гандлююць, не хаваючыся, небяспечнымі для жыцця і здароўя беларусаў рэчывамі? Міліцыя не можа прыцягваць іх да крымінальнай адказнасці, бо новыя «парашкі» немагчыма за дзень-два ўнесці ў наркатычныя спісы.

І тут, на маю думку, павінны дзейнічаць ведамствы, якія непасрэдна абавязаны кантраляваць інтэрнэт. Чаму барыгам дазваляць так свавольнічаць? Ніхто з нас не застрахаваны ад таго, што і нашы блізкія могуць з'ехаць з глузду, паспытаўшы «эйфарыйны парашок».

Яўген ВАЛОШЫН, загадчык аддзела журналісцкіх расследаванняў «Звязды».

Усе факты, ілюстрацыі і гутаркі, прыведзеныя ў гэтым матэрыяле, пацверджаны фота і аўдыя.

Як барыгі рэкламуюць свой тавар у інтэрнэт-суполках?

Прывядзём некалькі прыкладаў агрэсіўнай рэкламы ў сеціве.

Вось адна з суполак з назвай *«Для аматараў якасці, Мінск (парашкі, таблы і курава...)»*

У апісанні пазначана:

«Усе міксы абсалютна легальныя на тэрыторыі РБ і РФ! Не ўтрымліваюць забароненых на тэрыторыі РБ рэчываў, гэтаму ёсць дакументальнае пацверджанне — заключэнне лабараторнай экспертызы. Так што ні вы, ні мы нічым не рызыкуем».

А ў суполцы *«Легальныя парашкі (сэкс і віскі, кокс карыбскі, маркі...)»* барыгі пазіцыянуюць сябе запраўскімі менеджарамі, эталонамі ветлівасці:

«Прыносім прабачэнне за тое, што не працавалі па тэхнічных прычынах!!! Тэлефануйце на новы нумар, усё ў наяўнасці...»

А ў суполцы *«Легальныя парашкі» і солі для ванны ў Мінску»* гандляры пераконваюць, што іх тавар — ледзьве не вітаміны:

«Мы не займаемся продажам наркотыкаў і не маем нічога агульнага з тымі, хто гэтым займаецца. Мы толькі дапамагаем людзям знайсці тое, што яны шукаюць...»

Адміністратар адной з наркасуполак пад мянушкай Вагід Віслы апісвае свой тавар у стылі запраўскага фармацэўта»: *«Лечыць прастуду, санлівасць, апатыю, прысутнічае пачуццё ўпэўненасці, можна не спаць да сямі сутак. Рэкамендаваная доза для спажывання чалавекам — 0,15 грама»*.

Адна з суполак у інтэрнэце, дзе беларусам прапаноўваюць небяспечныя сінтэтычныя рэчывы.

Тыя, што адмініструюць «парашковыя» суполкі, хаваюць свае твары. Але не баяцца пакідаць рэальныя тэлефонныя нумары.

ВЁСКА Блонь. Мінчанка Таццяна ўваходзіць у вясковы дом і слупянее. «Колькі ж тут дзяцей? Адно, два, тры — ой! Два і тры... — гэта, відаць, адно і тое ж, — ад разгляду здымкаў на сцяне жанчына пераходзіць да агляду дома. — Тут столькі пакояў, што я баюся ўявіць, колькі ў гэтай сям'і чалавек!»

Да апошняга моманту жонкі з дзвюх сем'яў не ведаюць, з кім іх памяняюць і ў якой сям'і ім давядзецца пражыць бліжэйшы тыдзень. Паводле правілаў праекта «Абмен жонкамі», жанчыны могуць пакінуць для сваёй наступніцы толькі «звод правілаў»: звычкі мужа, капрызы дзяцей, сямейнае меню і грошы, на якія сям'я павінна пражыць тыдзень.

— Я ўвогуле ўдзячная, што мы пазнаёміліся з той сям'ёй, — расказвае **мінчанка Таццяна, удзельніца першага выпуску праграмы.** *— Зараз мы з імі сустракаемся, як з роднымі людзьмі. Хоць умовы, у якія мы трапілі на праекце, былі для мяне экстрэмальныя.*

Здымкі першай серыі праекта праходзілі паралельна ў Мінску і ў вёсцы Блонь. Прадзюсары праграмы на сем дзён памянялі мінчанку Таццяну на маці шасці дзяцей з в. Блонь Святлану. Першая — спецыяліст па рабоце з кліентамі ў банку, другая — работнік ЖКГ. У першай — муж працуе дырэктарам фірмы, а ў другой — вадзіцелем...

Для Таццяны жыццё ў вёсцы стала шокам. Гатаваць яна ўмела толькі сняданак і гарніры, ды і слоікі на зіму ніколі не закручвала. Аднак новы муж не рабіў ёй зніжак: жанчына і палола, і гатавала, і бялізну мыла. Праўда, толькі першыя тры дні. Згодна з ўмовамі праекта, толькі напачатку новая жонка жыве паводле звычаяў сям'і, наступныя тры дні яна ўсталёўвае свае парадкі.

Валерыя — мужа Таццяны — гледачы запомняць надоўга: суп новай жонкі мужчына выліваў ва ўнітаз, а бліны, якія так старанна пякла для яго Святлана, выкідваў праз акно. І хоць збольшага ўсё было зроблена для карцінкі, асаблівую непрыязь да тлустай ежы мужчына меў.

— Я нарадзіўся ў вёсцы і пэўны час пражыў там, — распавядае Валерый. — Карову-казу падаіць магу, каня запрэгчы таксама. Але вось бліны і слой тлушчу ў супе я не пераношу і не ем. Яшчэ з дзяцінства.

ЦЕМНАСКУРАЯ БАЛЕРЫНА? ПА-ЗА ЧАРГОЙ!

Як паведамілі прадзюсары, першы сезон праграмы будзе ўключаць дзевяць серый, якія ўжо падрыхтаваны. Але пошук новых сем'яў не спыняецца.

— Любая сям'я можа быць цікавай, — гаворыць **кіраўнік праекта Сяргей ХОМІЧ.** *— Галоўнае — шчырасць і жаданне здымацца. Атрымаецца праект ці не, залежыць у першую чаргу ад удзельнікаў. Нас нацыянальнасці. Яшчэ адзін важны пункт — дзе сям'я жыве.*

— Рэаліці заўсёды вельмі цяжка здымаць, — працягвае Сяргей Хоміч. — Таму мы пакуль адмаўляем людзям, якія жывуць у інтэрнатах або аднапакаёвых кватэрах. Развярнуцца з аператарам там будзе вельмі няпроста. Таксама па зразумелай прычыне мы не адбіраем для здымак сем'і з дзецьмі да года.

Паводле слоў Сяргея Хоміча, 80 адсоткаў анкет, якія прыходзяць на АНТ, запаўняюць жанчыны. Сваім мужчынам яны пра гэта не кажуць. І калі муж даведваецца, ён часцей за ўсё ад удзелу адмаўляецца.

ПРАВІЛЫ ЗДЫМАК

— Нам праект пайшоў на карысць: мы сталі больш разняволеныя, — прызнаюцца Таццяна і Валерый. — Такога кшталту выпрабаванне часам вельмі карысна для сям'і: ты пачынаеш цаніць тое, на што раней не звяртаў увагі.

Герояў праграмы камеры здымаюць сем дзён. Самому аператару катэгарычна забаронена размаўляць з членамі сям'і. Акрамя аператара, побач з сям'ёй знаходзяцца выканаўчы прадзюсар і асістэнт. Увечары начаваць з сям'ёй абавязкова застаецца асістэнт. Яго задача — сачыць за тым, каб ва ўдзельнікаў рэаліці не ўзнікала спакусы патэлефанаваць дадому. Яшчэ адна небяспека — высвятленне адносін паміж новымі мужам і жонкай. Згодна з правіламі, новых «сужэнцаў» нельга пакідаць самнасам ні на хвіліну.

Ці прыжывецца новая праграма ў Беларусі, пакажа час. Тым часам у Румыніі «Абмен жонкамі» папулярны настолькі, што мясцовае ТБ запусціла ў эфір ужо 19 (!) сезон праекта.

Ілья ЛАПАТО.

Фота прэс-службы АНТ.

«МЫ ХАЦЕЛІ, КАБ КОЖНАЯ СЯМ'Я ПАГЛЯДЗЕЛА НА СЯБЕ ЗБОКУ...»

24 верасня на АНТ прэм'ера — рэаліці-праект «Абмен жонкамі»

Як стаць удзельнікамі праекта?

1. Зайсці на сайт «АНТ» і запоўніць адмысловую форму заяўкі.

2. Па пытаннях удзелу ў праекце можна звярнуцца да выканаўчага прадзюсара перадачы Арыны Федаровіч (тэл. 8 (029) 649 41 51).

Беларускія «Дажынкі» ў Польшчы

У гмінах Гайнаўка (вёска Дубічы Царкоўныя) і Заблудаў (Рыбалы) адсвяткавалі беларускія «Дажынкі». Свята пачалося з дажынкавага абраду і святой літургіі ў праваслаўным і каталіцкім храмах, пасля чаго адбыліся канцэрты, якія сабралі больш за дзве тысячы гледачоў. Сваё майстэрства разам з ансамблямі «Прымакі», «Капэла Падляская», «Цаглінкі», хорам «Куранты» і іншымі беларускімі калектывамі Беласточчыны прадэманстраваў і народны ансамбль песні і танца «Церніца» з Мінска.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона)

18 октября 2011 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 50%.

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Трансформатор КТП-400 Линия электропередачи, протяженность 23,2 м Мощение, площадь 367 кв. м	9 553 744	г. Могилев, Чаусское шоссе, 3 км	955 380

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 23 64 24, 28 41 00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: 18.10.2011 г. в 11-00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Информация о земельном участке: Площадь земельного участка – 1,3533 га, кадастровый номер – 725450100001000287.

5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015, Региональная Дирекция № 600 ОАО «БПС-Банк», код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 17.10.2011 г.; время: 17.00.

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

9. Извещения о проведении первых открытых аукционов по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы 25.03.2011и 27.05.2011 в газете «Звязда» № 55, № 89.

Раўнівец забіў брата-блізнюка «канкурэнта»

КАХАННЕ — небяспечная «гульня». Так можна канстатаваць тое, што адбылося пад Віцебскам. Раўнівец, дарэчы, забіў не новага «прыхільніка прыгажосці» сваёй каханай, а яго брата-блізнюка.

Пасля ўчынення забойства злодзей некалькі гадоў хаваўся ад правасуддзя ў суседняй Расіі. Ды і там парушыў закон: асудзілі за тое, што «парэзаў» сабутэльніка. Падчас следства высветлілася, што затрыманага ўжо не першы год шукаюць за ўчыненае забойства ў нашай краіне. А яшчэ раней ён меў судзімасць за бойку.

Як паведаміла «Звяздзе» **Марына ШАЎЧЭНКА, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах і аналізе судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці**, калі забойцу вызвалілі з расійскай калоніі, ён быў перададзены ў нашу краіну для «адказу за былы грэх».

«Забойства па памыльцы» пад Віцебскам адбылося яшчэ ў 2002 годзе. Трагедыя адбылася на тэрыторыі садовага таварыства, дзе адпачывалі былая каханая будучага забойцы, яе новы кавалер і яго брат-блізнюк, а таксама сяброўка.

Раўнівец прыехаў на дачу ў нецвярозым стане. Мо яшчэ і таму пераблытаў братоў? Калі ўбачыў «канкурэнта» ў ложку з дамай, ударыў яго сякерай. Ды толькі потым зразумеў, што не таму адпомсціў, бо побач у ложку ляжала сяброўка каханай.

Малады чалавек памёр яшчэ да прыезду «хуткай». Спрабаваў раўнівец забіць і сапраўднага канкурэнта ў каханні, ды таму пашанцавала. «Канкурэнт у каханні» атрымаў траўму ад сякеры, якую раўнівец кінуў у яго, ды здолеў адбіць удар.

Прыгаворам суда раўнівец атрымаў 16 гадоў пазбаўлення волі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дыскусійная трыбуна

Ці зможа новы Следчы камітэт удасканаліць праваахоўную сістэму Беларусі?

Новае ведамства створана ў адказ на, як было заяўлена на нядаўняй высокай нарадзе, «няякасную працу органаў папярэдняга расследавання», «фальсіфікацыі», «расхлябанасць».

Але ці зможа Следчы камітэт стаць прынцыпова новай у плане якасці структурай, якая будзе адрозніваца ад іншых структур, што праводзяць аператыўна-вышуковую дзейнасць?

З першага студзеня новага года павінна напоўніцу запрацаваць новае ведамства — Следчы камітэт Беларусі. Па задумках, СКБ павінен аздаравіць следчую сістэму ў краіне.

Цягам апошніх гадоў я рыхтаваў артыкулы, дзе канстатаваліся відавочныя праколы папярэдняга следства ў некаторых гучных крымінальных справах. Кожная з гэтых гісторый выклікала нежартоўны рэзананс з боку звычайных чытачоў. І не таму, што людзі ў нас чапляюцца на вуду сенсацый, а таму, што вынік расследаванняў быў відавочна несправядлівым альбо выяўляў у канкрэтных выпадках нядбальнасць праваахоўнай сістэмы абараніць простага чалавека.

Прывяду некалькі прыкладаў. Вось гісторыя жыхара Мінска Леаніда Тарасенкі, якога ў 2004 годзе памылкова пасадзілі ў калонію. Хуліган ударыў нагой па яго машыне, паваліўся на зямлю і зламаў тазабедраную костку. Нават тэарэтычна атрымаць такую траўму з-за ўдараў, якія нібыта нанёс Леанід Тарасенка, было немагчыма. Але следчы, які праводзіў «расследаванне», так выканаў сваю «працу», што невінаватага чалавека, па чыёй машыне быў нанесены ўдар, кінулі за краты. Цалкам апраўдаць Леаніда Тарасенку змаглі дзякуючы яго ўласнай прынцыповасці, а таксама ўмяшальніцтву намесніка Генпракурора Беларусі. Але дзе сёння служыць афіцэр, які праводзіў «расследаванне» і зламаў жыццё чалавеку? Павышаны ў званні і займае высокую пасаду, вырашае лёсы іншых людзей. І гэта пасля таго, як гісторыя трапіла ў прэсу, а Міністэрства юстыцыі выплачвала незаконна асуджанаму чалавеку вялікія грошы.

Ці ўзгадаем гісторыю са смерцю Дзяніса Клімачова ў Бабруйскім следчым ізалятары ў пачатку 2000-х. Яго пазбавілі волі на некалькі месяцаў. Але праз тыдзень адсідкі сваякі атрымалі труп: цела хлопца было знявечана гематомамі, нос, а таксама восем рэбраў зламаны. Жанчыны, якія знаходзіліся ў суседняй камеры і давалі паказанні падчас следства, цвёрда заявілі, што ў ноч смерці Дзяніса з яго здзекаваліся кантралёры СІЗА.

Але следчы раённай пракуратуры так «расследаваў» справу, што здарылася неверагоднае: па яго словах, траўмы Клімачоў «нанёс сабе сам». Пры дапамозе Генеральнай пракуратуры расследаванні неаднаразова аднаўляліся. Але абласная пракуратура не спяшалася шукаць таго, хто наносіў Клімачову пабоі. І некаторыя следчыя з гэтай нагоды прыцягваліся да дысцыплінарнай адказнасці. Затое загадчык аддзела, які справу курыраваў, пайшоў на павышэнне і працягвае служыць. А кат, які збіваў Дзяніса, дагэтуль на волі.

У прэсу траплялі дзясяткі падобных гісторый, абвергнуць якія не было чым. Толькі ў прыватных гутарках с журналістамі некаторыя службовыя асобы тлумачылі праколы і фальсіфікацыі сваёй працы словамі «ну вы ж усё разумееце...»

А зразумела адно: выпадкі кругавой парукі і «замазвання» крымінальных спраў наносяць удар па даверы да беларускай праваахоўнай сістэмы. І ад гэтага — куды большыя страты, чым ад саміх злачынстваў, якія не былі расследаваны належным чынам.

У тым ліку і пра ўзгаданыя праблемы ў жніўні вялася гутарка на высокай нарадзе па пытаннях удасканалення сістэмы органаў папярэдняга расследавання. Падымаліся пытанні «неналежнага выканання службовых абавязкаў супрацоўнікамі органаў папярэдняга расследавання». Некаторыя прыклады працы следчых органаў наўпрост называліся «прыкладамі расхлябанасці праваахоўнай сістэмы», недобрасумленныя дзеянні следчых — «прамымі фальсіфікацыямі».

У выніку было прынята рашэнне стварыць асобнае ведамства — Следчы камітэт Беларусі. Сюды павінны прыйсці найлепшыя спецыялісты з Камітэта дзяржаўнага кантролю, з пракурорскіх органаў, з МУС і іншых структур.

Аднак ці будзе здольным новае ведамства ўдасканаліць сістэму папярэдняга расследавання? Лічу, што толькі пры ўмове рэальнай незалежнасці Следчага камітэта ад іншых структур, калі ўсе службовыя асобы змогуць поўнасцю працаваць па-за прынцыпамі кругавой парукі. Калі следчыя змогуць абапірацца выключна на закон. Бо калі гэта ўмова не будзе выконвацца, Следчы камітэт, на маю думку, стане ўсяго толькі чарговым ведамствам, якое будзе мець права на аператыўна-вышуковую дзейнасць. І сітуацыі ў цэлым стварэнне СКБ, напэўна, тады не зменіць.

Але хочацца верыць у найлепшае, тым больш што патрэба ва ўдасканаленнях даўно наспела.

Яўген ВАЛОШЫН.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Строительство многоквартирного жилого дома по ул. Ауэзова, 8»

Информация о застройщике:
Общество с ограниченной ответственностью «ИНТЕХНОСТРОЙ», зарегистрированное решением Минского горисполкомом от 17 июля 2003 г. № 1183 (регистрационный номер № 100980743), расположенное по адресу: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сторожевская, дом 8, помещение 9; принимавшее участие в строительстве крупнопанельного пятисекционного 9-этажного многоквартирного жилого дома № 8 (по генплану) по ул. Матусевича (микрорайон «Масюковщина-5) в городе Минске (режим работы: понедельник-пятница с 9.00 до 17.30, обеденный перерыв с 13.00 до 13.30).

Информация о проекте строительства:
1. Цели проекта: строительство жилого дома.
2. Этапы строительства: отсутствуют.
3. Сроки реализации строительства: август 2011 года – июнь 2012 года.
4. Сведения о прохождении государственной экспертизы: заключения ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 20.04.2011 № 326-60/11 и от 14.05.2011 № 331-60/11.
5. Сведения о месте нахождения строящегося дома и его характеристики: строящийся жилой дом будет располагаться в микрорайоне Чижовка по ул. Ауэзова и иметь следующие характеристики:
• серия дома: М 111-90;
• количество квартир: 132, в том числе 57 однокомнатных, 57 двухкомнатных, 18 трехкомнатных.
• количество подъездов: 1;
• количество этажей: 19;
• остекление лоджий: да;
• технический этаж – да;
• лифт – да;
• помещения для стоянки и хранения автомобилей и мотоциклов – нет;
• погреба – да (во всех квартирах первого этажа);
• кладовые – да (в трехкомнатных квартирах);
• помещения для размещения штатных работников товарищества собственников – да;
• магазины, другие помещения – нет;
• объекты недвижимости, связанные с многоквартирным жилым домом, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией на данный дом и расположенные на одном земельном участке, предоставленном для его строительства, включая элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, в том числе стоянка, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома, стоимость или частичная стоимость строительства которых включена в цену договора создания объекта долевого строительства: внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации; объекты благоустройства и озеленения территории, повысительная насосная станция.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства в данном многоквартирном жилом доме предлагается 15 (пятнадцать) квартир по цене одного квадратного метра общей площади **7 500 000 белорусских рублей.**

Уплата цены договора производится дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей или единовременно.

По соглашению сторон застройщиком дольщику может быть предоставлена скидка.

6. Данные о правах застройщика на земельные участки и их площади: составленные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков от 25.06.2011 №№ 500/907-3900 (участок площадью 0,0945 га с кадастровым номером 500000000002007561 для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома), 500/907-3901 (участок площадью 0,0061 га с кадастровым номером 500000000002007562 для строительства и обслуживания ПНС), 500/907-3902 (участок площадью 0,0505 га с кадастровым номером 500000000002007563 на период строительства многоквартирного жилого дома), 500/907-3903 (участок площадью 0,7513 га с кадастровым номером 500000000002007564 на период строительства многоквартирного жилого дома). Право собственности: правообладатель Республика Беларусь, право пользования: правообладатель ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».

Границы земельных участков: ограничены с севера – зданием административно-бытового назначения; с юга – детским садом, с запада – многоквартирным жилым домом переменной этажности; с востока – общеобразовательной средней школой № 131.

Благоустройство: автомобильная парковка на 37 машиномест, а также увеличение парковок близлежащих территорий на 58 машиномест; плиточное покрытие, детские площадки, озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

7. Количество самостоятельных частей в жилом доме, передаваемых Застройщиком Дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома: 15 квартир.

8. Нежилые помещения, не входящие в состав общего имущества: нет.

9. Состав общего имущества: лифтовые, мусоропроводная камера, электросчетовая, общие коридоры, лестницы и межлестничные площадки, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся внутри жилых или нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, благоустройства и озеленения.

10. Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию: июнь 2012 года.

11. Сведения о договоре строительного подряда: договор от 12.07.2011 № 59/05-11, заключенный ООО «Интехнострой» (Заказчиком) с ОАО «МАПИД» (Генподрядчиком).

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком, в установленное им время и в присутствии его ответственного представителя, с соблюдением требований техники безопасности. Также с объектом долевого строительства можно ознакомиться в офисе уполномоченного представителя Застройщика: ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел.: 8 017 2 900 901, 8 029 1 907 901) или на сайте vivainvest.by.

Директор В.В. Расолько

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Многоквартирные жилые дома №№ 40А, 40Б (по генплану) в микрорайоне Каменная горка-5 со встроенно-пристроенными помещениями по ул. Проектируемой № 3»

Информация о застройщике:
Общество с ограниченной ответственностью «ИНТЕХНОСТРОЙ», зарегистрированное решением Минского горисполкомом от 17 июля 2003 г. № 1183 (регистрационный номер № 100980743), расположенное по адресу: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сторожевская, дом 8, помещение 9; принимавшее участие в строительстве крупнопанельного пятисекционного 9-этажного многоквартирного жилого дома № 8 (по генплану) по ул. Матусевича (микрорайон «Масюковщина-5) в городе Минске (режим работы: понедельник-пятница с 9.00 до 17.30, обеденный перерыв с 13.00 до 13.30).

Информация о проекте строительства:
1. Цели проекта: строительство жилых домов.
2. Этапы строительства: – отсутствуют.
3. Сроки реализации строительства: июль 2011 года – сентябрь 2012 года.
4. Сведения о прохождении государственной экспертизы: заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 371-60/11 от 29.04.2011.
5. Сведения о месте нахождения строящегося дома и его характеристики: строящиеся жилые дома будут располагаться в микрорайоне Каменная горка-5 по ул. Проектируемой № 3 и иметь следующие характеристики:

Дом 40А (по генплану):
• серия дома: М 111-90;
• количество квартир: 108, в том числе 22 однокомнатных, 32 двухкомнатных, 35 трехкомнатных и 19 четырехкомнатных;
• количество подъездов: 3;
• количество этажей: 9;
• остекление лоджий: да;
• технический этаж – да;
• лифты - да;
• помещения для стоянки и хранения автомобилей и мотоциклов – нет;
• погреба – да (во всех квартирах первого этажа);
• кладовые – нет;
• помещения для размещения штатных работников товарищества собственников – нет;
• магазины, другие помещения – нет;
• объекты недвижимости, связанные с многоквартирным жилым домом, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией на данный дом и расположенные на одном земельном участке, предоставленном для его строительства, включая элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, в том числе стоянка, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома, стоимость или частичная стоимость строительства которых включена в цену договора создания объекта долевого строительства: внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации; объекты благоустройства и озеленения территории.

Дом 40Б (по генплану):
• серия дома: М 464-9-У1;
• количество квартир: 217, в том числе 50 однокомнатных, 69 двухкомнатных, 98 трехкомнатных;
• количество подъездов: 6;
• количество этажей: 9;
• остекление лоджий: да;
• технический этаж – да;
• лифты – да;
• помещения для стоянки и хранения автомобилей и мотоциклов – нет;
• погреба – да (во всех квартирах первого этажа);
• кладовые – да (в трехкомнатных квартирах);
• помещения для размещения штатных работников товарищества собственников – да;
• магазины, другие помещения – 8 встроенно-пристроенных административных помещений (первый этаж, 3-6 подъезды);
• объекты недвижимости, связанные с многоквартирным жилым домом, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией на данный дом и расположенные на одном земельном участке, предоставленном для его строительства, включая элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, в том числе стоянка, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома, стоимость или частичная стоимость строительства которых включена в цену договора создания объекта долевого строительства: внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации; объекты благоустройства и озеленения территории.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства в данном многоквартирном жилом доме предлагаются **25 (двадцать пять) квартир** по цене одного квадратного метра общей площади **7 500 000 белорусских рублей.**

Уплата цены договора производится дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей или единовременно.

По соглашению сторон застройщиком дольщику может быть предоставлена скидка.

6. Данные о правах застройщика на земельные участки и их площади: составленные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков от 09.07.2011 №№ 500/907-4005 (участок площадью 1,9628 га с кадастровым номером 500000000006006185 на период строительства объекта), 500/907-4006 (участок площадью 0,3512 га с кадастровым номером 500000000006006186 для строительства и обслуживания жилого дома № 40Б), 500/907-4007 (участок площадью 0,1900 га с кадастровым номером 500000000006006187 для строительства и обслуживания жилого дома № 40А). Право собственности: правообладатель Республика Беларусь, право пользования: правообладатель ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».

Границы земельных участков: ограничены с севера – ул. Казимировской; с юга – сопредельным участком для строительства детских яслей-сада на 230 мест с бассейном, с запада – сопредельным участком для строительства общеобразовательной школы на 1020 учащихся; с востока – сопредельным участком для строительства многоквартирных жилых домов №№ 16, 17 (по генплану).

Благоустройство: две автомобильные стоянки по 50 машино-мест, плиточное покрытие, детская площадка, озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

7. Количество самостоятельных частей в жилом доме, передаваемых Застройщиком Дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома: 25 квартир.

**8. Нежилые пом

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Дзевам самы час заняцца навуковымі даследаваннямі, а Шалі не павінны забывацца, што чым менш ведаеш — тым мацней спіш

ВАЕН. Будзеце поўнасцю ўпэўненыя ў сваіх сілах і праваце. Толькі трэба быць больш асцярожнымі з выказваннямі, бо апаненты могуць патлумачыць іх не на вашу карысць. Варта таксама асцерагацца плётак. Не паказвайце навакольным уразлівых месцаў. Пачынайце цікавыя справы, абнаўляйце свае праекты — перад вамі могуць адкрыцца новыя перспектывы, калі вы не будзеце залішне прынцыповымі.

ЦЯЛЕЦ. На працы справы ідуць досыць добра, да вас будуць прыслухоўвацца калегі і нават начальства. Верагодны поспех у фінансавых справах і ў бізнэсе. Асцярожней з інфармацыяй — асабліва калі яна датычыцца асабіста вас. Займіце чакальную пазіцыю і паступайце, па магчымасці, абдумана і мудра. Нягледзячы на поспехі, вы не зможаце пазбавіцца ад пачуцця, што вам чагосьці не хапае. У той жа час вы будзеце валодаць каштоўнай інфармацыяй (разам са здольнасцю яе аналізаваць). Менавіта гэта цяпер стане галоўным памочнікам у працы і ў асабістым жыцці.

БЛІЗНЯТЫ. У панядзелак не варта спяшацца з ажыццяўленнем новых планаў — гэты дзень лепш прысвяціць завяршэнню спраў. У аўторак важна не спазняцца, асабліва на працу. Серада выдатна падыдзе для таго, каб будаваць планы на будучыню, і чым яны будуць падрабязней — тым лепш. Гэты ж дзень будзе ўдалы для падрыхтоўкі нейкай аддаленай па часе справы — напрыклад, вандравання. Лепш дзейнічаць рашуча, ні ў чым не сумняваючыся. У пятніцу выявіце выключныя здольнасці да імправізацый у дзелавой гутарцы. Але, калі падрыхтуецеся да яе, справа пойдзе яшчэ лепш.

РАК. Скажыце рашучае «не» ляноце, выкарыстайце любую магчымасць пусціць у ход свае веды і навыкі. Калегі будуць гатовы падтрымаць вас і дапамагчы пераадолець цяжкасці. У аўторак прыкрае непаразуменне пагражае перайсці ў канфлікт, але прадухіліць яго будзе ў вашых сілах. У другой палове тыдня зможаце дамагчыся ўсяго, чаго пажадаеце, за кошт ветлівасці і тактоўнасці. У гэты дзень больш слухайце, чым гаварыце. У суботу вас могуць наведаць цікавыя ідэі. У выхадныя дні паклапаціцеся аб прыгажосці і ўтульнасці ў вашым доме.

ЛЕЎ. Рашэнне штодзённых задач запатрабуе шмат сіл і часу. Асабліва калі дзейнічаць давядзецца ў адзіночку. У кампаніі ж аднадумцаў усё пройдзе нашмат лягчэй. У панядзелак могуць быць кантакты з дзелавымі партнёрамі, але вынікі не апраўдаюць выдаткаваных на іх дасягненне намаганняў. Так што паспрабуйце глядзець на ўсё рэалістычна і хутчэй пазбавіцца ад ілюзій. У аўторак вас будзе чакаць поспех практычна ва ўсіх распачынаннях. Грэх не выкарыстаць такія магчымасці. У сераду ўважліва прыслухвайцеся да парад сяброў. А дзелавыя сустрэчы адкладзіце, калі атрымаецца, да суботы. У нядзелю ж не будзьце залішне даверлівымі.

ДЗЕВА. Тыдзень спрыяльны для навуковых даследаванняў і адкрыццяў. Трымайце свае ідэі і планы пры сабе. Цяпер вам неабходна праявіць ініцыятыву і ажыццявіць свае задумы на практыцы. Калі вы не падманваеце сябе, то перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці і будзе спадарожнічаць удача. Не адкладайце рашэнне праблем у доўгую скрыню. Серада — спрыяльны дзень для новых распачынанняў і неабходных набыццяў для дома. Могуць з'явіцца складанасці ў адносінах з сябрамі.

ШАЛІ. Супакойцеся і не мітусіцеся, плывіце па цячэнні. У патрэбны час яно само вынесе вас туды, куды трэба. На працы верагодныя праблемы, звязаныя з інфармацыяй. Таму не забывайце: чым менш ведаеш — тым мацней спіш. Паспрабуйце рацыянальна расходаваць свае сілы, пазбягайце перагрузак. Хаця б кароткі адпачынак вам проста неабходны.

СКАРПІЁН. Надыходзіць добры час для творчых праектаў, таму вам спатрэбяцца такія якасці, як ініцыятыўнасць і рашучасць. У аўторак з'явіцца магчымасць выхаду на больш высокі прафесійны ўзровень з добрымі перспектывамі ў кар'еры. У чацвер не варта прызначаць важныя сустрэчы, бо, нягледзячы на ўсе прыкладзеныя намаганні, вы абавязкова спозніцеся. У выхадныя праявіце трохі мяккасці і пяшчоты ў стаўленні да блізкіх людзей.

СТРАЛЕЦ. Лепш не плануйце рашэнні жыццёва важных задач, а, калі ёсць магчымасць, аддаць пабольш часу для адпачынку. На працы неабходна праявіць сабранасць і пунктуальнасць. Верагодна часовае пагаршэнне адносін з начальствам. Могуць паўстаць невялікія, але адчувальныя сямейныя праблемы. Лепш нікуды не спяшацца. Падумайце, перш чым нешта сказаць або распачаць нейкае дзеянне.

КАЗЯРОГ. Тыдзень можа быць складаным і супярэчлівым. Наваліцца шмат разнастайных спраў, і вы не адразу зможаце вырашыць, за якую з іх брацца ў першую чаргу. Магчыма, з'явіцца заступнік або начальнік, які будзе ставіцца да вас добразычліва. Можа пачацца новы адлік у вашай кар'еры. Бясконцыя, хоць і ўдалыя паездкі і рашэнне службовых праблем могуць выцягнуць з вас энергію. У чацвер магчыма раптоўнае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту.

ВАДАЛЕЙ. Вострыя жыццёвыя моманты згладзяцца, знойдзецца больш паразумення з навакольным светам. Прафесійныя справы пачнуць развівацца дзякуючы падтрымцы партнёраў. Магчымыя ўдалыя перамовы па крэдытных пытаннях, не выключана атрыманне спонсарскай дапамогі або яшчэ якіх-небудзь матэрыяльных выгод. Спрыяльны перыяд для засваення новых турыстычных маршрутаў.

РЫБЫ. Абавязкова павысіцца ваша ўпэўненасць у сабе. Магчыма нечаканая змена месца пражывання або працы. Панядзелак — добры дзень для стасункаў, пачатку навучання. Гэты дзень таксама ўдалы для перамоў з дзелавымі партнёрамі. У аўторак карысная актыўнасць і ініцыятыва з вашага боку. Серада добрая для разбурэння старога і пачатку новага, у гэты дзень у вас будзе вялікая прастора для выбару. Нядзелю лепш прысвяціць пасіўнаму адпачынку, увогуле не варта прымаць сур'ёзных рашэнняў.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ДРЭННА СКОНЧЫЛІ

У вёсцы Парэчча Пінскага раёна пад раніцу загарэлася хата. Пакуль суседзі заўважылі дым, пакуль выклікалі пажарных, 53-гадовы гаспадар і яго госць, 49-гадовы аднавяскавец, задыхнуліся ў дыме. Папярэдняй версіяй узгаранння названа курэнне ў нецвярозым стане.

Яна СВЕТАВА.

Ну і ну!

ІНФАКІЁСК ПАЦЯРПЕЎ ЗА БАНКАМАТ

28-гадовы беспрацоўны жыхар абласнога цэнтра пераблытаў інфакіёск з банкаматам, пасля чаго была... заведзена крымінальная справа па факце знішчэння альбо пашкоджання маёмасці, паведамілі аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама. Будучы «пад мухай», малады чалавек паспрабаваў зняць грошы з банкамата. Ён уставіў пластыкавую картку ў адтуліну, але на экране сталі з'яўляцца незразумелыя сімвалы. Кліент не ўцяміў, што гэта не банкамат, а размешчаны побач інфакіёск, і вельмі разлаваўся, стукнуў рукой па маніторы, які трэснуў. Гэта было зафіксавана камерай відэаназірання.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД
Па гарызанталі: Гамонлік. Рука. Бут. Удар. Неба. Дуга. Абух. Атон. Хата. Зуброўка. Атабрын. Тур. Рак. Крыга. Канцэрт. Рынак. Збор. Пог. Ода. Пагата. Агат. Сагата. Вор. Пак. Кулуары. Ніл. Конь. Улад. Куфар. Хлеб. Ротар. Хадабэра. Лек. Лян. Корцы. Гак. Юпа. Кольцы.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.58	19.05	12.07
Віцебск —	6.47	18.54	12.07
Магілёў —	6.48	18.55	12.07
Гомель —	6.44	18.51	12.07
Гродна —	7.13	19.20	12.07
Брэст —	7.14	19.20	12.06

Месяц

Маладзік 27 верасня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Фядоры, Віктара, Германа, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*

К. *Марыны, Яніны, Герарда, Германа, Тодара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

24 верасня

СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ МОРА.

1641 год — нарадзіўся (вёска Ятра, зараз Навагрудскі раён) Станіслаў Незабытоўскі, беларускі мемуарыст. Вучыўся ў Навагрудскім езуіцкім калегіуме. Неаднаразова абіраўся дэпутатам ад навагрудскай шляхты на сесіі Трыбунала ВКЛ. Аўтар падрабязных успамінаў, дзе апісаны падзеі 1682—1700 гадоў на Навагрудчыне і Случчыне. Яго мемуары — каштоўная крыніца па гісторыі грамадска-палітычнага і прыватнага жыцця Беларусі і Літвы канца XVII ст. Захавалася больш за 600 лістоў Незабытоўскага да розных асоб (захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве). Памёр у 1717 годзе.

1944 год — больш чым за паўгода да перамогі над гітлераўскім фашызмам быў апублікаваны амерыканскі «План Моргентау» аб пасляваенным уладкаванні Германіі. Прапанаваная міністрам фінансаў ЗША Генры Моргентау «Праграма па прадухіленні развязвання Германіяй 3-й сусветнай вайны» прадугледжвала расчляненне і дэцэнтралізацыю Германіі, інтэрнацыяналізацыю Рурскай вобласці, поўную ліквідацыю германскай цяжкай прамысловасці і авіяцыі, дэмілітарызацыю, ператварэнне Германіі па сутнасці ў адсталую аграрную краіну. Рузвельт у рэшце рэшт з такімі падыходамі не пагадзіўся. Але Гітлер не прамінуў выкарыстаць «План Моргентау» ў сваіх прапагандысцкіх мэтах, заклікаўшы нацыю змагацца да апошняга, каб пазбегнуць пакаранняў, прадугледжаных амерыканцамі.



Цытата дня:

«Мы павінны быць удзячны тым, хто ўказвае нам на нашы недахопы».

Блез Паскаль (1623—1662), французскі матэматык, фізік, філосаф.

САРОКА

У павер'ях усходніх славян сарока з-за сваёй звычкі цягнуць у сваё гняздо яркія, бліскучыя рэчы асацыіруецца з крадзяжом, зладзействам. У казках з той жа нагоды яе называлі модніцай. Акрамя таго, сароку клічуць пляткарніцай і балбатушкай: можна часта назіраць, як дзве сарокі, якія сядзяць побач на дрэве ці плоце, вітаюць адна адну гучнай балбатнёй, быццам дзве жанчыны, якія распавядаюць адна адной навіны, стоячы каля калодзежа.

- У той жа час, бесклапотная балбатлівасць сарокі пад вакном была вернай прыкметай хуткага атрымання добрых вестак ці візіту доўгачаканых гасцей.
- Прыкмячалі: калі сарока хаваецца пад дах, будзе сцюжа ці працяглы дождж.
- Калі сарока залятала ў сенцы, гэта прадказвала хуткі крадзеж у хаце.
- Забітую сароку вешалі ў хляве, як надзейны абярэг ад нячыстай сілы.
- Добрым знакам удалай рыбнай лоўлі былі сарокі, якія лятаюць парамі. Гэтая прыкмета была шматразова праверана. Акрамя таго, існуе даволі простае тлумачэнне: калі надвор'е сырое і халоднае, сарокі пакідаюць гнёзды па адной, каб другая птушка грэла птушанят. Калі сарокі ляцяць парамі — значыць, надвор'е будзе цёплым і спрыяльным для лоўлі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

НЯДЗЕЛЯ, 25 верасня

Грамадская дзейнасць увянчаецца поспехам. Верагодныя грашовы прыбытак, выйгрыш. Добра збіраць даўгі, запасацца матэрыяльнымі рэсурсамі.

ПАНЯДЗЕЛАК, 26 ВЕРАСНЯ

Энергіі дня спрыяюць узаемаразуменню ў асабістых адносінах, сімпатыі, каханню. Дзень неспрыяльны для пачатку судовага разгляду, зносу будынкаў.

АЎТОРАК, 27 верасня

Спрыяльны дзень для важных, сур'ёзных спраў, для ўстаноўкі новага абсталявання. Аднавіце працу над закінутым праектам.

СЕРАДА, 28 верасня

Дзень падыходзіць для духоўных заняткаў, якія спрыяюць ачышчэнню кармы. Можна зносіць старыя пабудовы, выкідваць непатрэбнае, рабіць генеральную ўборку.

ЧАЦВЕР, 29 верасня

Дзень спрыяльны для пачатку пераходу на дыету для пахудання, медыцынскіх і касметычных працэдур, падчас якіх з вашага цела нешта выдаляюць.

ПЯТНІЦА, 30 верасня

Дзень падыходзіць для завяршэння адносін, якія сябе вычарпалі, раставання з тымі, з кім не па дарозе, прабачэння. Вярніцеся да таго, што ніяк не атрымлівалася. Зараз больш спрыяльны час.

СУБОТА, 1 кастрычніка

Дзень падыходзіць для абнаўлення, адпачынку, радасці і адчування поўнасці жыцця. Можна пайсці ў госці або наведаць культурнае мерапрыемства. Пікнік на прыродзе і лазня — таксама добры варыянт.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Пірог з баравікамі і бульбай

Спатрэбіцца: *малако — 100 мл, дрожджы (сухія) — 10 г, яйка — 1 шт., цукар — 0,5 ст. л., алей — 1 ст. л., соль, грыбы — 300 г, бульба — 400 г, цыбуля — 150 г, сыр цвёрды — 150 г, смятана (або маянэз).*

Грыбы нарэзаць даволі буйна, пласцінкамі. Пасмажыць на патэльні на алеі.

Зоймемся цестам. У цёплае (не гарачае) малако дадаць цукар і дрожджы, размяшаць. Паставіць у цёплае месца, пакуль не падняцца капялюшык (на гэта спатрэбіцца 10—15 хвілін). Яйка трохі ўзбіць з соллю. Дадаць 1ст. л. алею, змяшаць. Усыпаць муку і ўліць дрожджы, якія падышлі. Вымесіць мяккае (не крутое) эластычнае цеста. Ёмістасць з цестам накрыць харчовай плёнкай або ручніком і паставіць у цёплае месца падыходзіць прыкладна на паўгадзіны. За гэты час цеста павялічыцца ўдвая.

Тым часам падрыхтуем астатнія інгрэдыенты для начынння. Бульбу пачысціць і нарэзаць тоненькімі кружочкамі (кавалачкі павінны быць досыць тонкімі, каб бульба паспела прапячыся). Цыбулю нарэзаць тонкімі паўколцамі. Сыр надзерці.

Цеста (а яно ў нас ужо праз 30 хвілін гатова) раскачаць таўшчынёй прыкладна 3 мм і выкласці ў змазаную алеем форму, зрабіць невялікія борцікі. Цеста трохі намазаць смятанай. Выкласці смажаныя грыбы, пасаліць і пасыпаць молатым чорным перцам. На грыбы выкласці цыбулю, а на яе — бульбу, трохі пасаліць. Намазаць смятанай. Пасыпаць сырам. Паставіць у разагрэтую да 180 градусаў духоўку і выпякаць каля 30 хвілін. Пры падачы можна пасыпаць зелянінай, можна падаць са смятанай.

Кабачковыя «пірожныя»»

Кабачок надзерці на буйной тарцы ў друшляк, пасаліць, пачакаць хвілін пяць, пакуль не ўбачым сок.

Надзёрты кабачок адціснуць. Дадаць да яго яйка, 1 ст. л. смятаны, на кончыку нажа гашаную соду, нарэзаны тонкай саломкай часнок і муку. Прычым колькасць мукі залежыць ад памеру кабачка: напрыклад, на сярэдні кабачок трэба 4 ст. л. мукі. Усё змяшаць, абсмажыць на патэльні ў выглядзе бліноў.

Рыхтуем начынку. Надзерці на сярэдняй тарцы сыр, здрабніць часнок і змяшаць з маянэзам. Для прыгожай праслойкі ў «пірожных» можна дадаць палову чайнай лыжкі куркумы.

Робім пірожныя. Шклянкай выразаем кружочкі. Кружочкі склейваем начынкай. Бакі трэба змазаць маянэзам і пракруціць на талерцы з нарэзаным кропам. Верх злёгку намазаць маянэзам і пасыпаць цёртым жаўтком. З перцу выразаць фігуркі і прысыпаць чорным кунжутам.

Вельмі эфектная закусачка атрымліваецца! Усе будуць у захапленні!

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Часам самыя звыклыя рэчы можна выкарыстаць незвычайным спосабам.

Аліўкавы алей, у які дададзены лімонны сок або белы вінны воцат у суадносінах 1/2 ад агульнага аб'ёму алею, дапаможа надаць бляск паліраванай мэблі.

Арахісавае масла здольнае выдаліць жавальную гумку з валасоў — досыць проста ўцерці яго.

Каляровыя алоўкі:* раскрышаны грыфель дапаможа замаскіраваць пашкоджанні драўлянай падлогі і мэблі.

-2788-

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Якую падушку выбраць?

Калі акінуць позіркам сапраўдны рынак пасцельных прылад, то мы ўбачым велізарны выбар напаўняльнікаў для падушак. Гэта пух, воўна, шалупінне грэчкі, камфарэль, штучны лебядзіны пух.

Дык з якім жа напаўняльнікам выбраць сабе падушку?

ПАДУШКА З НАПАЎНЯЛЬНІКАМ «ПУХ»

Напаўняльнікам такой падушкі можа быць лебядзіны пух, пяро птушкі і іх сумесь. Пух — самы цёплы напаўняльнік. Надзейна захоўваючы цеплыню, пух дазваляе бесперашкодна выпарацца лішняй вільгаці. Падушку адрознівае вялікі аб'ём пры малой вазе. Пасля кароткачасовага сціску яна хутка аднаўляе ранейшы аб'ём.

ПАДУШКА З НАПАЎНЯЛЬНІКАМ «НАТУРАЛЬНАЯ ВОЎНА»

Падушкі з гэтым напаўняльнікам цёплыя, лёгкія, мяккія. Трэннем валокнаў адно аб адно воўна ўтварае электрастатычнае поле, якое добра ўплывае на здароўе чалавека. Воўна — унікальны матэрыял, які не толькі сагрэе вас у халодны час года, але і падорыць дабратворную прахалоду ў спякоту. Натуральная воўна — гэта гаючы матэрыял, які спрадвеку выкарыстоўваецца ў лячэбных і прафілактычных мэтах. Боль у спіне, суставах, мышачныя болі, рэўматычныя захворванні — вось далёка не поўны спіс хвароб, якія эфектыўна прадухіляе і дапамагае пераадолець поўсць.

ПАДУШКА З НАПАЎНЯЛЬНІКАМ «ШАЛУПІННЕ ГРЭЧКІ»

Шалупінне грэчкі — адзіны ў сваім родзе напаўняльнік, які забяспечвае мяккі кропкавы масаж, пастаянныя паветраныя патокі, здольнасць падушкі прымаць профіль кожнай часткі цела. Што, у сваю чаргу, дабратворна ўплывае на арганізм: прыводзіць да актывізацыі энергетычных каналаў, падтрымлівае актыўнасць мышцаў, стабілізуе працу апорна-рухальнай сістэмы, нервовай, крывяноснай і лімфатычнай сістэм.

ПАДУШКА З НАПАЎНЯЛЬНІКАМ «КАМФАРЭЛЬ»

Камфарэль — гэтае полае, сіліканізаванае валакно, якое прайшло дадатковую тэрмаапрацоўку, за кошт чаго яно ператвараецца ў шарыкі дыяметрам 7 мм. Адмысловая антыбактэрыяльная апрацоўка валокнаў надзейна абараняе выраб ад бактэрый і кляшчоў. Пры гэтым нават пасля шматразовага мыцця апрацоўка захоўвае свае ўласцівасці. Падушкі з напаўняльнікам «камфарэль» утрымліваюць цеплыню, не перашкаджаюць цыркуляцыі паветра. Іх можна мыць як уручную, так і ў пральнай машыне, яны хутка сохнуць, выдатна захоўваюць форму, не выклікаюць алергічных рэакцый. У іх доўгі перыяд эксплуатацыі.

ПАДУШКА З НАПАЎНЯЛЬНІКАМ «ШТУЧНЫ ЛЕБЯДЗІНЫ ПУХ»

Для людзей, якія аддаюць перавагу больш мяккім вырабам, рэкамендуюцца падушкі з напаўняльнікам з заменніка лебядзінага пуху. Напаўняльнік складаецца з кампазіцыі розных найтанчэйшых пустацелых валокнаў, здольных утрымліваць вакол сябе паветра. Падушкі проста дыхаюць, пры гэтым захоўваючы мяккасць. Валакно адмыслова апрацавана сіліконам, дзякуючы чаму сіліканізаваныя валокны рухаюцца незалежна адно ад аднаго, за кошт чаго напаўняльнік не збіваецца, не злежваецца, выдатна захоўвае форму пры доўгай эксплуатацыі.

Якую падушку, з якім напаўняльнікам выбраць, вырашаць вам, бо кожны чалавек індывідуальны і знойдзе падушку, якая падыходзіць менавіта яму.

-2789-

Усміхнемся

Муж з жонкай у ложку. Жонка:

— Ну што, зноў у цябе нічога не атрымліваецца?! Напэўна, ты ўжо не мужык!

— Як гэта не мужык?! З іншымі ж атрымліваецца!

☺

— Прывітанне, як лета прайшло?

— Прывітанне, цудоўнае лета! Заўтра гіпс, дарэчы, здымаюць.

☺

Заўсёды марыў быць сведкам на вяселлі — лічы, у цэнтры тусоўкі, а жаніцца не трэба.

☺

Мужчыны з метро! Карыстайцеся дэзадарантамі!

☺

— Цікава, а чаму ва ўніверсітэтах 1 верасня піяцікурснікі не цягаюць на плячах першакурсніцу?

— Ды ты проста ніколі ў студэнцкім інтэрнаце не была...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 4609 Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12